ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЎЗ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 258 (3366) Аўторак, 12 лістапада 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Сазэцкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

2000 чырвоных абозаў

ЧЫТА, 10. За Кастрычніцкія дні ў ў Чыту прыбыло каля 2000 чырвоных абозаў, якія аддалі звыш 5000 цэнтнэраў хлеба.

Прэм'яваньне шклозаводу імя Домбаля

Продаўлікат выдаў Барысаўскаму шклозаводу імя Домбаля прэмію ў 8.000 руб. за перавышэньне экспартнага плану ў 1927-28 годзе і выкананьне плану ў 1928-29 г.

Гэтыя даягненьні завод атрымаў, дзякуючы выключнай старанноасьці і сьвядомасьці рабочых домбалеўцаў.

Уся гэта сума пойдзе на культурна-асьветнае абслугоўваньне рабочых, на прэміі па вынаходніцтве і рацыяналізатарскіх мерапрыемствы, а таксама на прэм'яваньне карысных рабочых прапаноў па палепшаньні якасьці экспартнай прадукцыі.

Праверка і чыстка партыі паднялі самакрытыку на нябывалую вышыню

З дакладу т. Яраслаўскага на пленуме ЦКК УсеКП(б)

МАСКВА. Вечарам 10-га лістапада закрыўся пленум ЦКК УсеКП(б). Раніцаю пленум заслухаў даклад тав. Яраслаўскага аб папярэдніх выніках праверкі і чысткі партыі. Адзначыўшы, што ў сярэднім па СССР чыстка на 40 проц. яшчэ не закончана, т. Яраслаўскі заявіў: даныя, якія маюцца, гавораць аб вялізнай падрыхтоўчай рабоце, праведзенай партарганізацыямі і праверачнымі камісіямі. Побач з гэтым прыйшлося канстатаваць і цэлы рад недахопаў—скажэньняў дакладных інструкцый ЦКК. Некаторыя праверкомы, замест таго, каб выявіць клясавы твар праверяемага, яго адносіны да вытворчасьці і генэральнай лініі партыі, удаваліся ў бытавыя падрабязнасьці. У радзе месц даваліся няправільныя лёзунгі. Асабліва многа «отсебятин» адзначана ў Сярэдняй Азіі.

Склад праверачных камісій вельмі здавальняючы. Сярод членаў праверкомаў звыш 80 проц. рабочых, пры чым каля 36 проц. непасрэдна занятых на вытворчасьці, 13 проц. — падпольшчыкаў. Праверка кіруючага складу партыі паказала наогул, што кіруючыя кадры партыі, за нямногімі выключэньнямі, зусім здаровы. Але, калі паглядзець, каго выключылі з кіруючага складу партыі, дык прыходзіцца зрабіць вывад, што падбор кіруючага складу ў шмат выпадках праводзіўся не па якасьці, а па прадстаўніцтве ад тэй ці іншай арганізацыі, або фабрыкі. Напрыклад, у Дагэстане ў адным раёне з 9 членаў райкому, пасьль нічога супольнага з партыяй ня мелі.

Праверка і чыстка партыі паднялі на нябывалую вышыню самакрытыку. Ва многіх ячэйках меў яшчэ месца зажым самакрытыкі, што прыводзіла да маўчаньня камуністых. Статычныя даныя паказваюць, што пры праверцы вытворчых і нявытворчых ячэек меліся памылкі. У ЦЧО, напрыклад, у рабочых ячэйках выключана 11 проц. усіх праверяных, а ва ўстановах 10,8 проц., на Украіне—9,9 проц. і 8,5 проц. Такім чынам, ва многіх арганізацыях процант выключаных у рабочых ячэйках вышэй процанту выключаных у ячэйках устаноў. У нямногіх арганізацыях наглядаюцца адваротныя зьявішчы. Зьдзіўляючы прыклад мы маем у Закаўказьзі, дзе ў рабочых ячэйках выключаны 1 процант, а ў вясковых—27,8 проц. У ячэйках устаноў надзвычайна мала выключана за бюракратызм. Меншы процант выключаных у савецкіх ячэйках паказвае, што самакрытыка ва ўстановах разгорнута больш слаба, чым на прадпрыемствах. Гэта прымусіла ў многіх мясцох праводзіць паўторную чыстку.

Пры апэляцыях трэба будзе ўважліва адносіцца да рабочых, якія ў большай частцы сыключаны за пасыўнасьць і, наадварот, больш сурова падыходзіць да апэляцый з боку камуністых ячэек устаноў. Трэба аднак памятаць, што ў ячэйках устаноў таксама маюцца выпадкі няправільнага выключэньня.

Пры чыстцы вясковых ячэек у шмат выпадках мела месца сьпешка, ператварэньне чысткі ў судзілішча. Тым ня менш, праверка вясковых ячэек мела вялізнае значэньне для аздараўленьня вясковай часткі партыі. Вакол чысткі ў вёсцы разгарнулася вялікая актыўнасьць беднаты і батрацтва. У шмат мясцох чыстка карэнным чынам вымяніла аблічча вёскі і вясковай ячэйкі. Вынікі чысткі вясковых ячэек гавораць аб вялікай засьмечанасьці. Многія выключаныя вясковыя камуністыя аказаліся кулакамі, многія актыўна супроцьдзейнічалі мерапрыемствам улады і партыі.

У агульных выніках чысткі—высокі процант выключаных за пасыўнасьць. Каля 13 проц. па вясковых, а таксама рабочых ячэйках. Гэта паказвае таксама, што партарганізацыі недастаткова актыўна ўцягвалі ў работу новых членаў партыі. Вялікі таксама процант выключаных за выконваньне рэлігійных абрадаў: каля 5 проц. агульнага ліку выключаных. У Сярэдняй Азіі, Дагестане, прышлося нават распусьціць некалькі ячэек з гэтае прычыны. Напрыклад, у Фэргане, у адным кішлаку рэлігійная сэкта рад гадоў існавала як партыйная ячэйка. Рад членаў партыі Сярэдняй Азіі аказаліся былымі і нават сучаснымі мулямі.

Мы мелі рад выключэньняў з партыі за правы ўхіл. Калі правыя ад разгавораў і прароцтваў пераходзяць да скажэньняў клясавай лініі на практыцы і фракцыйнай работы і нават выпуску падпольных лістовак, калі яны адкрыта заяўляюць аб нязгодзе з лініяй партыі —зразумела такіх членаў партыі мы не маглі пакінуць у радох УсеКП(б); пастаўленая перад партыяй задача ачышчэньня ад чужых, прымазаўшыхся, клясава-варожых элемэнтаў у асноўным выканана, хаця быць-можа ў асобных арганізацыях няпоўнасьцю. Неабходна прыцягнуць да чысткі прафсаюзныя камсамольскія масы, разгарнуць вакол чысткі здаровую самакрытыку, якая не пераступае праз партыйнасьць і не ператвараецца ў зброю для чужых нам людзей. Чысьціць трэба не сьняшаючыся, друк павінен паказваць на толькі дрэнныя, але і добрыя прыклады. У нас ёсьць дасканалыя ячэйкі, як у горадзе, так і ў вёсцы. Яны вядуць, напрыклад, узорную работу па сацыялістычнай перабудове вёскі і г. д. Неабходна ўдумліва, чула аднесьціся да апэляцый, лік якіх будзе значна большы, чым у папярэдніх чыстках. Мы павінны закончыць чыстку да XVI зьезду партыі, няма патрэбы прадаўжаць тэрміны. Аднак, не бяда, калі дзе-нідзе чыстка да зьезду ня будзе закончана, толькі-б яна праводзілася правільна, пабальшавіцку.

У спрэчках па дакладу тав. Яраслаўскага выступілі т. т. **Шкіратаў, Сольц, Караваёў, Багданаў** (Ленінград) і іншыя. У заключным слове тав. Яраслаўскі адзначыў, што неабходна пільна вывучаць вельмі багатыя матар'ялы праверкі і чысткі партыі. Трэба зьвярнуць увагу на факты роспуску ячэек. У некаторых мясцох партарганізацыі відавочна перасялілі, мэханічна распусьцілі рад ячэек. Наогул да вялікіх лічбаў і вялікіх процантаў выключаных трэба прыглядацца вельмі сур'ёзна, бо таксама вялікія лічбы звычайна сьведчаць аб няправільным падыходзе да чысткі тэй ці іншай арганізацыі.

Вельмі кепска стаіць справа з вярбоўкаю ў партыю. Толькі за апошні час, калі ЦК і ЦКК забілі трывогу, выначыўся ў гэтых адносінах некаторы пакуль што нязначны пералом.

Пленум ухваліў пастанову ЦК і ЦКК ад 30 верасьня аб папярэдніх выніках праверкі і чысткі радоў УсеКП(б), рэдагаваньне пастановы па дакладзе тав. Яраслаўскага даручыў прэзыдыуму.

Даклад Закаўкаскай Краёвай КК РСІ з абвесткі пленуму зьняты і будзе заслуханы на прэзыдыуме ЦКК.

Мільёны пралетараў ва ўсім сьвеце дэманстравалі сваю волю да барацьбы

Паліцэйскі тэрор у краінах капіталу

КАСТРЫЧНІЦКІЯ ДНІ ЗА МЯЖОЮ

Ня гледзячы на шалёны тэрор, дэманстрацыі у Варшаве адбываліся на працягу цэлага дня

ВАРШАВА, 9. 7-га лістапада, у дзень 12-й гадавіны Кастрычніка, у Варшаве ў цэлым радзе раёнаў адбыліся дэманстрацыі, якія разганяліся паліцыяй. Дэманстрацыі адбываліся на працягу цэлага дня. Мабілізаваная паліцыя змагла, аднак, перашкодзіць аб'яднаньню раёных дэманстрацый і не дапусьціла іх да цэнтру гораду. Праведзены шматлікія арышты. Усе буйныя фабрыкі ў Варшаве былі абкружаны паліцыяй. У некаторых, найбольш буйных фабрыках, напрыклад, у «Лільпоп», «Норблін», «Паравоз», паліцыя была ўведзена ў сярэдзіну фабрыкі.

Дэпутат камфракцыі сойму Сыпула, які прабаваў каля фабрыкі арганізаваць мітынг, быў абкружаны паліцэйскім атрадам. Усіх, хто прабаваў падыйсьці да дэпутата, паліцыя разганяла прыкладамі. Найбольш упартых уцягвалі за браму, абшуквалі і адпраўлялі ў турму. Дэпутат Сыпула быў абкружаны паліцыяй звыш гадзіны.

У Лодзі камдэпутату Росяку, ня гледзячы на ўсе паліцэйскія перашкоды, ўдалося арганізаваць мітынг, а потым і дэманстрацыю. Паліцыя некалькі раз разганяла дэманстрантаў, але яны зноў зьбіраліся каля Росяка.

На дапамогу пешай паліцыі прыбыў вялікі атрад коннай, які некалькі раз атакаваў дэманстрантаў. Паліцэйскія атакі працягваліся каля гадзіны. У часе дэманстрацыі многа арыштавана, вялікі лік цяжка зьбітых.

Дамброўскі горны раён 7-га лістапада нагадваў сабою ўзброены лягер. Мясцовы рабочы актыў яшчэ да 7-га лістапада быў разгромлены і арыштаваны. Каб не дапусьціць выступленьня дэпутатаў камфракцыі сойму, паліцыя абкружыла памяшканьне дэпутата камфракцыі Кэрузальскага. Як толькі Кэрузальскі вышаў на вуліцу, паліцыя зараз-жа накіравалася за ім на аўтамабілях. Усе фабрыкі і капальні былі заняты паліцыяй. Паліцыя не дапусьціла Кэрузальскага ні на адну фабрыку, ці капальню. Усе рабочыя сходы, нават самыя нязначныя, зараз-жа разганяліся паліцыяй.

У Верхняй Сілезіі адбывалася тое-ж самае. Паліцыя заняла ўсе пляцы, пункты, дзе маглі-б адбыцца мітынгі. Рабочых не дапускалі нават на рынак. Пры гэтым паліцыя зрабіла шматлікія арышты. Аб характары паліцэйскіх спосабаў сьведчыць той факт, што ў Катовіцах праходжым не дазвалялася спыняцца на вуліцы, як гэта практыкуецца толькі ў часе стану аблогі.

У дзень 7-га лістапада камуністыя ў турме пачалі дэманстрацыйную галадоўку і арганізавалі дэманстрацыю, якая была спынена пры дапамозе паліцыі.

У Вільні палітзьняволеныя ў часе прагулкі наладзілі дэманстрацыю.

***

Ня гледзячы на фашысцкі тэрор, працоўныя Заходняй Беларусі напярэдадні 12-й гадавіны Кастрычніцкіх сьвят правялі рад мітынгаў і дэманстрацый. «Кур'ер Віленскі» № 255 паведамляе пра адну з дэманстрацый у Вільні, якая з чырвонымі сьцягамі і камуністычнымі лёзунгамі накіроўвалася з Завальнай вул. на Троцкую і раскідала шмат адозваў. Дэманстрацыя была разагнана паліцыяй, каторая правяла рад арыштаў і канфіскавала чырвоны сьцяг.

«Ня гледзячы на паданае вышэй,— кажа «Кур. Віл.» — учора ноччу бадай ва ўсіх пунктах гораду раскіданы камуністычныя адозвы і таксама разьвешана некалькі чырвоных сьцягаў»...

У Данцыгу адбыліся вялікія дэманстрацыі. Як падаюць газэты, на адным з транспарантаў, якія несьлі дэманстранты, быў надпіс: «мы—масы—за дзяржаўную здраду. Няхай жывуць савецкія рэспублікі!»

АНГЛІЯ

У Лёндане орган кампартыі «Уоркэрс Лайф» выпаў спэцыяльным нумарам з артыкуламі і ілюстрацыямі, прысьвечанымі 12-й гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі. Камуністычная партыя апублікавала новую брашуру аб 5-цігадовым пляне.

ЧЭХА-СЛАВАКІЯ

У радзе гарадоў на шматлікіх заводах і фабрыках адбыліся рабочыя мітынгі і дэманстрацыйныя забастоўкі.

Паліцыя яшчэ напярэдадні зрабіла рад вобыскаў, у прыватнасьці, у сакратарыяце ЦК КПЧ і камітэце праскай арганізацыі кампартыі. 7-га лістапада ўсе паліцэйскія сілы былі пастаўлены на ногі, каб не дапусьціць вулічнай дэманстрацыі. Тым ня менш ва многіх гарадох паліцыі не ўдалося папярэдзіць дэманстрацыі.

У Празе кампартыя арганізавала 6 вялікіх рабочых сходаў, з якіх два паліцыяй былі разагнаны. Выходзячы са сходу рабочыя дэманстравалі ў гонар Савецкага Саюзу. У часе сутычак з паліцыяй, якая прабавала разагнаць дэманстрантаў, рабіліся арышты. Сярод арыштаваных — камдэпутат Готвальд.

ФІН�ЛЯНДЫЯ

Ня гледзячы на забарону паліцыі, 7-га лістапада ў радзе гарадоў Фінляндыі рабочыя прабавалі арганізаваць масавыя сходы і дэманстрацыі. Паліцыя ўсюды сілай разганяла сходы і дэманстрацыі.

НАРВЭГІЯ

У Осло, ня гледзячы на дрэннае надвор'е, адбыліся дэманстрацыі і мітынгі.

Дэманстрацыі адбыліся таксама ў Бэргэне і інш. гарадох Нарвэгіі.

БЭЛЬГІЯ

У Брусэлі 7-га лістапада адбылася вулічная дэманстрацыя, арганізаваная бэльгійскай кампартыяй. Дэманстрацыя прайшла пад лёзунгамі, якія заклікаюць да абароны Савецкага Саюзу, да барацьбы супроць пагрозы імпэрыялістычнага нападу на СССР і г. д.

Пасьля дэманстрацыі ў «Доме трамвайшчыкаў» адбыўся масавы мітынг, на якім Жакмонт (ад імя ЦК бэльгійскай кампартыі) і Вільямс (ад імя камсамолу) выступалі з прамовамі. Аўдыторыя з энтузіязмам вітала прамоўцаў.

ЛІТВА

З прычыны 12-й гадавіны Кастрычніка ў Літве распаўсюджваліся рэвалюцыйныя адозвы і вывешваліся чырвоныя сьцягі.

Паліцыя арыштавала некалькі чалавек па абвінавачаньні ў арганізацыі сьвяткаваньня гадавіны.

ЭСТОНІЯ

У Рэвэлі 7-га лістапада былі раскіданы камуністычныя адозвы. У гэтых адозвах адзначаліся дасягненьні СССР і заклікаўся пралетарыят Эстоніі да дэманстрацыі супроць нападу на СССР.

Нумар газэты эстонскай рабочай партыі быў канфіскаваны. З прычыны гэтага эстонская рабочая партыя пры дапамозе лятучак абвясьціла аб скліку мітынгу, які, аднак, быў недапушчаны паліцыяй.

ЛАТВІЯ

У Дзьвінску, ня гледзячы на паліцэйскую забарону, адбылася дэманстрацыя салідарнасьці з савецкім пралетарыятам. У дэманстрацыі прымала ўдзел звыш 500 рабочых.

У Рызе ў радзе фабрычных раёнаў рабочыя прабавалі наладзіць дэманстрацыі. Паліцыя ўсюды разганяла дэманстрантаў і арыштоўвала рабочых. Паліцыя абходзіла рабочыя кварталы і здымала чырвоныя сьцягі, якімі былі ўпрыгожаны дамы. Па ўсіх рабочых кварталах былі распаўсюджаны адозвы нелегальнай латвійскай кампартыі з заклікам да дэманстрацыі салідарнасьці з пралетарыятам СССР. Напярэдадні 12-й гадавіны ахранка зрабіла ў Рызе шматлікія вобыскі і арышты, каб перакошдзіць арганізацыі вулічных дэманстрацый.

ЗВЫШ 400 АРЫШТАВАНЫХ САВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН У ХАРБІНЕ

ШАНХАЙ. Паводле вестак агенцтва Го-Мінь, за апошнія дні ў Харбіне арыштавана 150 савецкіх грамадзян па абвінавачаньні ў арганізацыі змовы з мэтаю наладзіць «непарадкі» ў дзень 12-й гадавіны Кастрычніка.

Уноч на 7-га лістапада па горадзе разьяжджалі 12 паліцэйскіх грузавікоў. Пад кіраўніцтвам агентаў охранкі арыштавана звыш 250 савецкіх грамадзян. Арыштаваныя былі пасаджаны на грузавікі і вывезены. Горад ахоўваўся ўзмоцненымі патрулямі.

12-я ГАДАВІНА КАСТРЫЧНІКА у СССР

800—тысячная дэманстрацыя на Чырвоным Пляцы

У цяперашнім годзе дыслякацыйныя задачы на Чырвоным Пляцы ўскладнілі ся. Добрая палова плошчы перахоплена дзеравяным плотам. І войскі, і дэманстранты прымушаны былі абмежавацца вузкай адлегласьцю, у цэнтры якое красавалася ўпрыгожаная лічбай «12» трыбуна над скрытым помнікам Мініну і Пажарскаму.

Побач з лічбай Кастрычніцкай гадавіны, прыцягвала ўсеагульную ўвагу яшчэ адна, на першы погляд вельмі мізэрная лічба—1. Сёньня і яна сьвяткуе, сёньня і ёй салютавалі мільёны працоўных.

Аб дасягненьнях пяцігодкі маляўніча гаварылі і шырокія стужкі плякатаў, якія віселі над пляцам, і дыяграмы, якія ўпрыгожылі сабою пабудаваную на скорую руку трыбуну.

Там, у глыбіні чырвонай нішы размясьціўся штаб Кастрычніка т. т. Сталін, Молатаў, Варашылаў, Калінін, Рыкаў, Енукідзе, Баўман...

Насупроць, бліскучы шэрымі каскамі настроілася войска, флянгі занялі броня-машыны, танкі і гарматы.

...Парад пачаўся роўна а 9-й гадзіне. Тав. Варашылаў у суправаджэньні тав. Убарэвіча аб'ехалі войска, якое выстраілася ў стужкаю.

— Гадавіна Кастрычніка,—пачаў сваё прывітаньне т. Варашылаў,—супала з першай гадавінай пяцігадовага пляну. Сацыялістычнае будаўніцтва вядзе нас уперад такімі гіганцкімі крокамі, што нават самыя заядлыя ворагі савецкай улады прымушаны прызнаць яе дасягненьні.

Прызнаньне, зразумела, не азначае іх спачуваньня нашай справе. Імпэрыялістыя працягваюць рыхтаваць вайну супроць Савецкага Саюзу. І невыпадкова т. Варашылаў значную частку сваёй прамовы прысьвяціў падзеям на К.-Усх. ч. На Далёкім Усходзе капіталістыя рукамі кітайскіх генэралаў прабуюць прамацаць устойлівасьць нашых граніц. Наколькі яны моцныя—у гэтым чан-кайшысцкія налётчыкі пераканаліся, папрабаваўшы сілу Чырвонай арміі на практыцы.

Кастрычніцкі парад на Чырвоным Пляцы характарны яшчэ ў гэтым годзе тым, што быў даны паказ дасягненьняў мэханізацыі Чырвонай арміі

„Даеш пяцігодку ў чатыры гады“

Затым на Чырвоны Пляц вышла першая калёна рабочай дэманстрацыі. Першым ідзе Баўманскі раён. Мора сьцягаў, чырвоных плякатаў, карыкатур. Большасьць плякатаў і лёзунгаў крычаць аб перамозе пяцігодкі, аб бесьперапынцы, аб цьвёрдай пастанове працоўных Масквы пашырыць і ўзмацніць сацыялістычнае будаўніцтва. Чэмбэрлены, Макдональды мінулых год зьмяніліся лічбамі, якія характарызуюць дасягненьні сацыялістычнага спаборніцтва першага году пяцігодкі. Агульны настрой —«Даеш пяцігодку ў чатыр гады».

Вялікую, але далёка не пахвальную ўвагу зьявярнулі дэманстранты цыцікам і малаверам, праваапартуністычным элемэнтам, якія спалохаліся імпэтнага размаху пралетарскае творчасьці. Дружны сьмех выклікае інсцэніроўка, каторая паказвае, як дрэнная кабыла, што заблыталася ў пастронках дапатопнае сахі, узьняўшыся на дыбы і задраўшы абшчы паны хвост, стараецца затрымаць ход трактарнай калёны.

«Субота» і «нядзеля» пакояцца ў труне, якую нясуць поп, патар і рабін. На тлу стых тварах трывога і спалох. А за імі вясёлая рабочая моладзь нясе савецкі «тыдзень-пяцідзеўку».

За баўманцамі падцягнуліся іншыя раёны.

Належнае атрымалі ад дэманстрантаў гультаі, п'яніцы, прагульшчыкі, бюракраты і інш. нечысьць. Не забыты і папы, кулакі і сусьветныя імпэрыялістыя. Тысячамі лёзунгаў і плякатаў вітаюць дэманстранты Чырвоную армію і яе авангард—Асобную Далёка-Ўсходнюю армію.

Толькі са зморкам замоўк пляц, і сьвяткаваньне перакінулася ў раёны. Паводле самага мізэрнага падліку праз Чырвоны Пляц прайшло ня менш 800 тысяч дэманстрантаў.

Кастрычніцкія дні ў Ленінградзе

ЛЕНІНГРАД, 9. Кастрычніцкія ўрачыстасьці закончыліся ў Ленінградзе арганізацыяй на пляцы Урыцкага вялізарнага масавага дзеяньня. У арганізаваній пры сьвятле дзесяткаў пражэктараў масавай інсцэніроўцы прынялі ўдзел звыш 50 прадпрыемстваў. Тэма інсцэніроўкі—выкананьне першага году пяцігодкі і ваенная небясьпека. У заключнай часьці прымалі ўдзел кавалерыя, танкі і інш. роду войскі. Інсцэніроўка закончылася апафэозам.

Камуністычнае прывітаньне ЦК УсеКП(б) ад брацкіх кампартый Захаду

МАСКВА, 11. ЦК УсеКП(б) атрымаў наступную тэлеграму з Лёндану: «Камуністычнае прывітаньне к 12-й гадавіне. З гонарам вітаем вялікае выкананьне пяцігадовага пляну пад кіраўніцтвам партыі.

Няхай жыве кампартыя СССР!

Няхай жыве камуністычны інтэрнацыянал!

Сакратарыят Брытанскае Кампартыі.

Такая-ж тэлеграма атрымана з Ленінграду, у якой рабочыя і работніцы, торыя сабраліся на сьвяткаваньне 7 лістапада, шлюць брацкае баявое прывітаньне генэральнаму штабу Кампартыі пралетарыяту СССР «Клінцы палкам аддаць усе сілы за барацьбу ўсіх працоўных і стварыць у самой Нямеччыне пралетарскую дзержаву.

Няхай жыве Савецкі Саюз!

200-тысячная дэманстрацыя ў Харкаве

ХАРКАЎ, 9. Кастрычніцкія ўрачыстасьці ў Харкаве выліліся ў сьвята індустрыялізацыі краю. У дэманстрацыі 7-га лістапада прынялі ўдзел звыш 200.000 працоўных. Тысячамі сьцягаў і плякатаў пралетарыят Харкава выказаў сваю непахісную волю выканаць сацыялістычную пяцігодку ў 4 гады, дае сваё цьвёрдае жаданьне пад кіраўніцтвам ленінскае партыі працягваць сацыялістычную будоўлю, даючы рашучы адпор правым капітулянтам і малаверам.

Узмацніць бальшавіцкі агонь па правых апартуністых

Некаторыя таварышы схільны думаць, што правы ўхіл у нашай партыі ўжо ў асноўным выкрыты, пабіты і што для яго шырокага прарастаньня ў нас няма патрэбнай глебы. Гэты погляд глыбока памылковы, гэта погляд прымірэнцаў. Бо гэта правыя гавораць аб тым, што ніякіх правых у нашай партыі ня было і няма, што ўсё пытаньні аб правым ухіле выдуманы з адной мэтай дыскрэдытаваць палітычна некаторую частку таварышоў і адсунуць іх ад кіраўніцтва. На чыстцы партыі, калі ўжо правых апартуністых пыталіся: «Вы правы?»—яны, ня міргнуўшы вокам, адказвалі: «Не, я стаю на пазыцыях генэральнай лініі партыі і ня згодзен толькі з некаторымі тактычнымі крокамі цяперашняга ЦК».

Усе даныя апошняга часу гавораць не аб памяншэньні небясьпекі з боку права-апартуністычных хістаньняў, не аб уціхаміраньні іх нападаў на партыю, а якраз **аб адваротным.** У галіне тэорыі правыя маюць зараз шырока разгорнутую і зусім закончаную праграму, выкладаную ў артыкулах і выступленьнях т. Бухарына. Калі ў яго артыкуле аб «Арганізаванай безгаспадарчасьці» дзеецца тэарытычнае ўгрунтаваньне поглядам правых па пытаньнях міжнародных, дык у «Заметках Экономиста» і ў вылажэньні «Политического завещания Ленина» яшчэ больш падрабязна разьвіваецца пункт погляду правых у пытаньнях унутранай палітыкі.

Працэс рэканструкцыі ўсяе гаспадаркі краіны і абвастрэньне на гэтай аснове клясавай барацьбы няўхільна на даным адрэзку часу «выклікаюць хістаньні ў дробна-буржуазных пластох насельніцтва, што знаходзіць сваё адлюстраваньне ў некаторых праслойках рабочае клясы і нават у радох партыі». (З рэзалюцыі XVI канфэрэнцыі). Гэта ўсваю чаргу дае ўсе падставы думаць, што выпадкаў праяўленьня правага ўхілу ў практычнай рабоце мы будзем мець у бліжэйшы час ніяк ня менш, чым мелі за апошнія месяцы. Не гавораны ўжо аб тым, што застаецца яшчэ шмат нявыкрытага, нявысьветленага, мы бясспрэчна будзем мець справу з працэсамі і зьявамі правага ўхілу ў практычнай рабоце, якія зараджаюцца і вырастуць на аснове магчымых **новых** памылак работнікаў, нядольных папальшавіцку супроцьстаяць націску дробна-буржуазнай стыхіі. Да таго-ж правыя, безнадзейнае банкрутства якіх з відавочнасьцю даведзена посьпехамі першага году пяцігодкі, дасягнутых партыяй наперакор панікёрскім прадраканьням правых,—ня толькі не прыхаваць дапушчаных імі памылак, а **ўпарта настойваюць на іх, і памылкі** [illegible]

орыяй і практыкай правага ўхілу, можна судзіць хаця-б на падставе таго факту, як яшчэ задоўга да адкрыцьця Астраханскае справы т. Угланаў на ячэйцы Сьвярдлоўскага універсытэту тэарытычна апраўдваў тое, што ў выніку было выкрыта ў Астрахані, і ад чаго так энэргічна адмаўляюцца ўсе правыя цяпер. Тав. Угланаў, гаворачы аб патрэбнасьці некаторай дэцэнтралізацыі гаспадарчай работы, зазначаў на галавацяпства, якое, нібы праяўляюць нашы кіруючыя гаспадарчыя органы, перашкаджаючы прыватнаму капіталу працаваць на рыбных промыслах. Сэнс яго прамовы зводзіўся да таго, што ня трэба скарачаць прыватніка на рыбных промыслах, перашкаджаючы прыватнаму капіталу працаваць на рыбных промыслах, а наадварот, папыраць. Ня дзіва, што пасьля прамовы т. Угланава аб патрэбнасьці падтрымаць прыватны капітал на рыбных промыслах, у некаторых кіраўнікоў рыбнай справай гэта думка атрымала пэўнае лёгічнае разьвіцьцё. Астраханскія рыбапрамысловыя арганізацыі ўзмоцнена марынавалі каапэрацыю і ўсярмерна падтрымлівалі прыватніка. У выніку—грубейшае скажэньне партыйнай лініі ў практычнай рабоце і рад крымінальных спраў.

Правыя, стараючыся прадставіць сябе ахвярамі чыёйсьці ламыснай палітыкі, няўхільна цьвердзяць, што калі ў іх ёсьць некаторыя нязначныя разыходзіны з партыяй у пытаньнях бягучай палітыкі, дык гэта зусім ня значыць, што яны ў барацьбе з партыяй схільны ўступіць на шлях фракцыйнасьці.

Такога-ж характару заявы партыяй чула і ад усіх апазыцый, што меліся калісьці ў партыі. Відавочна, шляхі разьвіцьця ўсякай апазыцыі ў партыі ў асноўным аднолькавыя. Памылкі, калі іх пачынаюць абараняць, вырастаюць у вялікія разгалосьсі з генэральнай лініяй партыі.

Фракцыйная работа прыходзіць, як няўхільны дадатак ідэёвых і арганізацыйных разгалосьсяў з партыяй. Так атрымалася і з правымі. Спробы стаць на шлях фракцыйнай работы з боку правых наглядаліся ўжо даўно. За апошні час у друку апублікаваны факты, якія гавораць аб далейшым разьвіцьці і паглыбленьні фракцыйнай работы правых. Сярод гэтых фактаў зварачае на сябе ўвагу фракцыйная работа камсамольцаў братоў Мацьвеевых у Чырвонапрэсьненскім раёне Масквы, дзе яны ня толькі адкрыта выступалі на беспартыйных сходах з яўна правапартуністычнымі прамовамі, але і вялі сякую-такую арганізацыйную работу. Ня менш характэрны выпадак з лістоўкай, якую склалі правыя ў абароне т. Бухарына і так званай «бухарынскай школы». Сюды-ж трэба далучыць фракцыйную вылазку Сьляпкова, які выступіў на сходзе парткалектыву с.-г. інстытуту ў Самары, супроць лініі партыі і з абаронай правай апазыцыі. Паводзіны Марэцкага і Цэйтліна на чыстцы партыі, выступленьне Зайцава ў Сараставе і г. д.,—усё гэта факты фракцыйнай дзейнасьці правай апазыцыі.

На словах у правых—асуджэньне фракцыйнасьці, на справе—**разгортваньне гэтай работы па ўсіх правілах фракцыйнага мастацтва.** У данным выпадку ў правых таксама поўнае супаданьне тэорыі з практыкай. У тэорыі правыя гавораць аб «заціску» ўнутры партыі, аб «секретарыятадержавин» і інш. Яны заклікаюць моладзь ня браць нічога на веру, а падыходзіць крытычна да таго вопыту, які ім перадае партыя. На практыцы гэта праламляецца ў антыпартыйным выступленьні камсамольцаў Мацьвеевых, у друкаваньні антыпартыйных лістовак, дзе гаворыцца зноў аб заціску, аб ганеньні на т. Бухарына і г. д.

Як-бы не прабавалі пасьля ўсяго гэтага правыя лідэры адмежавацца і зваліць са сваіх плеч адказнасьць за фракцыйную дзейнасьць асобных членаў правай апазыцыі,—партыя і масы разумеюць, што паміж тэорыяй правага ўхілу і яго рэальным выяўленьнем існуе самая непарыўная сувязь і ўзаемадзейнасьць.

Партыя павінна ўзмацніць барацьбу з правым ухілам у тэорыі і на практыцы, партыя павінна пакончыць з фракцыйнымі выпадамі правай апазыцыі

К. М.

Гаміданаўскія налётчыкі распісаліся ва ўласным машэньніцтве

Прысуд над 38 апратэставаны кітайскім пракурорам

Нават кітайскі пракурор палічыў сябе абавязаным апратэставаць прысуд харбінскага «суду» над 38 савецкімі грамадзянамі. Гэткія весткі, якія паступаюць з японскіх крыніц.

Нават пракурор, якога ніхто, зразумела, ня стане падазраваць у праызмернай мяккасьці, нават гэта «плоть от плоти» мукдэнскіх і нанкінскіх генэральскіх клік, вымушаны прызнаць, што савецкіх грамадзян дарэмна засудзілі за «падрыхтоўку да мецяжу і захопу дзяржаўнай тэрыторыі».

Зусім зразумела, што, у сувязі з гэтым пракурорскім пратэстам, сярод кітайскіх судовых і адміністрацыйных улад пануе, як зазначаецца ў тэлеграме, «вялікае замяшаньне». Ды як жа. Башыбузукі, злоўлены на гарачым учынку, злоўлены на яўнай падтасоўцы абвінаваўчага акту. Пракурор прызнае, што у горшым выпадку, тыя 38 савецкіх грамадзян, якія кінуты харбінскім судом у турму тэрмінам на 5 і 7 год, маглі быць абвінавачаны толькі ў наладжваньні, або ўдзеле ў нелегальным сходзе. **Ніякіх іншых абвінаваўчых матар'ялаў ня было і няма.**

У такой абстаноўцы зусім ня дзіўна, што харбінскія ўлады, у тым ліку і чжан сюэ-ляпаўскі «суд замяшаліся і бязрадна аглядаюцца наўкола ў пошуках выхаду з няпрыемнага становішча. У якасьці самых адданых лёкаў міжнароднага капіталу, яны добра ведаюць, што справа ня толькі ў выпраўленьні «памылкі» харбінскага суду. Каты кітайскіх рабочых і сялян ва што-б там ні стала прабавалі апраўдаць разбойніцкі налёт на К.-Усх. ч. спасыланьнем на камуністычную «прапаганду», нібы, выкрытую ў харбінскім савецкім консульстве.

Пры такіх умовах адмяніць прыгавар харбінскага суду, значыць, на справе разьбіць дашчэнту ўсю так званую «прававую базу» гаміданаўскіх налётчыкаў, г. зн. распісацца ва ўласным ашуканстве.

„Даеш пяцігодку ў чатыры гады“

Затым на Чырвоны Пляц вышла першая калёна рабочай дэманстрацыі. Першым ідзе Баўманскі раён. Мора сьцягаў, чырвоных плякатаў, карыкатур. Большасьць плякатаў і лёзунгаў крычаць аб перамозе пяцігодкі, аб бесьперапынцы, аб цьвёрдай пастанове працоўных Масквы пашырыць і ўзмацніць сацыялістычнае будаўніцтва. Чэмбэрлены, Макдональды мінулых год зьмяніліся лічбамі, якія характарызуюць дасягненьні сацыялістычнага спаборніцтва першага году пяцігодкі. Агульны настрой —«Даеш пяцігодку ў чатыр гады».

Вялікую, але далёка не пахвальную ўвагу зьявярнулі дэманстранты цыцікам і малаверам, праваапартуністычным элемэнтам, якія спалохаліся імпэтнага размаху пралетарскае творчасьці. Дружны сьмех выклікае інсцэніроўка, каторая паказвае, як дрэнная кабыла, што заблыталася ў пастронках дапатопнае сахі, узьняўшыся на дыбы і задраўшы абшчы паны хвост, стараецца затрымаць ход трактарнай калёны.

«Субота» і «нядзеля» пакояцца ў труне, якую нясуць поп, патар і рабін. На тлу стых тварах трывога і спалох. А за імі вясёлая рабочая моладзь нясе савецкі «тыдзень-пяцідзеўку».

За баўманцамі падцягнуліся іншыя раёны.

Належнае атрымалі ад дэманстрантаў гультаі, п'яніцы, прагульшчыкі, бюракраты і інш. нечысьць. Не забыты і папы, кулакі і сусьветныя імпэрыялістыя. Тысячамі лёзунгаў і плякатаў вітаюць дэманстранты Чырвоную армію і яе авангард—Асобную Далёка-Ўсходнюю армію.

Толькі са зморкам замоўк пляц, і сьвяткаваньне перакінулася ў раёны. Паводле самага мізэрнага падліку праз Чырвоны Пляц прайшло ня менш 800 тысяч дэманстрантаў.

Генэральская война ў Кітаі

У ПРАВІНЦЫІ ХУНАНЬ ІДУЦЬ УПАРТЫЯ БАІ

ШАНХАЙ, 10. У правінцыі Хунань адбываюцца упартыя баі з шматлікімі стратамі з абодвух бакоў. Нанкін, як звычайна, пашырае весткі

Сваячасова выпраўляючы памылкі асобных праверкомаў, узьнімем генэральную чыстку партыі на яшчэ большую палітычную вышыню

Выправіць на ходу памылкі

АСОБНЫЯ ПРАВЕРКОМЫ ДАПУСЬЦІЛІ У СВАЁЙ РАБОЦЕ ГРУБЫЯ ПАЛІТЫЧНЫЯ СКАЖЭНЬНІ

Замест глыбокай работы ўсёй партыйна-палітычнай работы некаторыя праверкомы займаліся «штэмпэляваньнем» і «верхаглядзтвам».

Аднэй з асноўных задач чысткі зьяўляецца вывучэньне палітычнага твару кожнага камуністага, праверка яго клясавай баяздольнасьці. Гэта задача ў асноўным з посьпехам праводзіцца ў жыцьцё пры чысткі ячэек КП(б)В. У выніку ў радзе ячэек і раённых партарганізацый (па **Менскай, Бабруйскай, Магілеўскай** і інш. округах) былі выкрыты права-ўхілісцкія справы, абураючае скажэньне клясавай лініі, змычка з клясавым ворагам, факты заціску самакрытыкі і г. д.

Але нельга прайсьці міма фактаў адваротнага парадку — блізарукай работы праверкомаў, калі ў працэсе чысткі праверачныя камісіі не заўважваюць права-апартуністычных скажэньняў, не выкрываюць асноўных недахватаў дадай арганізацыі. У выніку прыходзіцца вызначаць паўторныя чысткі, або праводзіць дадатковую праверку партарганізацый.

Падамо выпадкі паўторнай чысткі па арганізацыях КП(б)В. Перш за ўсё трэба адзначыць пастанову ЦКК па выніках чысткі **Коханаўскай** райпартарганізацыі (**Аршанчына**), аб якіх пісала ўжо «**Зьвязда**». Чыстка гэтай партарганізацыі прайшла бяз удзелу мас і ня выкрыла недахватаў і скажэньняў лініі партыі, якія былі дапушчаны ў практыцы Коханаўскай раённай арганізацыі. Прэзыдыум ЦКК прапанаваў Аршанскай АКК правесьці паўторную чystку Коханаўскай арганізацыі.

Прэзыдыум Гомельскай АКК скасаваў праведзеную чystку ячэйкі **Палесельсаюзу** і вызначыў паўторную чystку гэтае ячэйкі. Гэта пастанова АКК ухвалена ў сувязі з нездавальняючымі вынікамі чысткі ячэйкі.

У ячэйцы і ва ўстанове былі выяўлены факты канкрэтных праяў правага апартунізму, абарона прыватніка, падхалімства, сямейнасьць, кругавая парука, бадай поўная адсутнасьць самакрытыкі. У ячэйцы заўважвалася боязьнь рашуча і адкрыта змагацца з бюракратычнымі скажэньнямі апарату. Асобныя камуністы зрасьліся з клясава-чужым элемэнтам.

Ня гледячы на гэта, пэрсанальная чystка ячэйкі Палесельсаюзу ня прынесла патрэбных вынікаў і ня выявіла тых, хто скажаў лінію партыі. Толькі адзін член ячэйкі выключаны з КП(б)В.

З прычыны поўнай неадпаведнасьці вынікаў пэрсанальнай чысткі з сапраўдным становішчам парт'ячэйкі, прэзыдыум АКК пастанавіў правесьці паўторную чystку ячэйкі Палесельсаюзу.

У газэце «Батрак» (Масква) была зьмешчана заметка аб недахватах пры чystцы ячэйкі саўгасу «**Веселава**» (Барысаўскі раён, **Меншчына**). Папярэдняе расьследваньне гэтай карэспандэнцыі паказала, што праверка і чystка саўгаскай ячэйкі прайшла пры абсалютнай адсутнасьці сялянства наўкольных вёсак. Між тым, іменна гэта ячэйка пры яе слабой рабоце сярод сялянства (ячэйка да чысткі не магла арганізаваць ніводнага калгасу) павінна была скарыстаць чystку для ўзмацненьня сувязі з вёскай і наблізкэньня ячэйкі да беднаты. Чystка прайшла без актыўнага ўдзелу рабочых саўгасаў, адсутнічала самакрытыка як з боку рабочых, так і партыйцаў. Аб рабоце ячэйкі зусім ня выказваліся. Парткалегія ЦКК даручыла Менскай АКК правесьці паўторную чystку гэтай ячэйкі.

Сярод спраў аб блізарукім праявдзеньні чысткі Асіпавіцкая справа заслугоўвае асаблівай увагі.

Тут чystка ня выявіла асобых недахватаў і скажэньняў лініі партыі. Аднак, праз месяц пасьля чысткі ў Бабруйскай газэце «Камуніст» зьяўляецца заметка «Трывожны сыгнал з Асіпавічы». Для расьследваньня фактаў, паданых у гэтай заметцы, выехала ў Асіпавічы спэцыяльная камісія акруговага камітэту партыі, якая выявіла правал партыйнага кіраўніцтва ў раёне, праявы правага ўхілу на практыцы, факты заціску самакрытыкі, склочніцтва і г. д. У сваёй пастанове па дакладу камісіі бюро АК і прэзыдыум АКК адзначылі, што пытаньне сацыялістычнага перабудаваньня вёскі, у прыватнасьці, калектывізацыі не стаяла ў цэнтры ўвагі партарганізацыі, як асноўная яе палітычная задача. У выніку ў раёне слаба праводзіцца калектывізацыя і каапэраваньне вёскі. Раённы камітэт даваў няправільныя палітычныя ўстаноўкі пры выяўленьні прычын невыстарчальнага тэмпу калектывізацыі. Працаўнікі райкому тлумачылі слабасьць калектывізацыі аб'ектыўнымі прычынамі, чым па сутнасьці змазвалі палітычнае значэньне гэтага пытаньня. Работа ў вёсках заняпала, не вялася агітацыйна-растлумачальная работа сярод батрацтва і беднаты. Усё гэта прывяло да таго, што ў справе калектывізацыі ў раёне фактычна праводзілася права-апартуністычная лінія. Бюро АК і прэзыдыум АКК канставалі невыстарчальную клясавую пільнасьць і клясавую беспрынцыповасьць асобных працаўнікоў раёну.

У барацьбе з рэшткамі трацкізму бюро райкому не праявіла патрэбнай рашучасьці. Самакрытыка ў раёне разгорнута слаба. Мела месца запалохваньне і асаджваньне таварышоў. Бюро АК і АКК пастанавілі пераабрацць бюро раённага камітэту, якое ня справілася з асноўнай задачай парткіраўніцтва раёнам, ня здолела вырашыць галоўных пытаньняў сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі, ня здолела забясьпечыць праявдзеньне генэральнай лініі партыі.

Адначасова зьняты з работы сакратар раённага камітэту партыі, старшыня райвыканкому і сакратар чыгуначнага парткалектыву. У сярэдзіне лістапада склікаецца па-зачарговая раённая партканфэрэнцыя.

Падкрэсьліваем: усё гэта выяўлена толькі пасьля чысткі. Мімаволі паўстае пытаньне, як ацаніць **такую чystку**, якая ня выкрыла ўсе гэтыя апартуністычныя справы, не прыцягнула да іх увагі раённай партарганізацыі, АК і АКК. Тлумачэньні, якія імкнецца даць па гэтым пытаньні газэта «Камуніст» (а таксама, паводле нашых вестак, і АКК) у заметцы аб Асіпавіцкай справе (ад 30 кастрычніка 1929 г.), абсалютна ня вытрымліваюць крытыкі. Замест таго, каб зрабіць палітычныя вывады з такой, мякка кажучы, «нядобраякаснай» чысткі, замест таго, каб завастрыць увагу праверкомаў да гэтых фактаў, пытаньне проста змазваецца. Газэта дала палітычна-шкодныя і няправільныя тлумачэньні памылак праверкому. Стаўшы на такі шлях, газэта і АКК дапусьцілі бязумоўную палітычную памылку. Нарэшце, мы ня можам ня выказаць свайго зьдзіўленьня, чаму памылкі праверкому абыйдзены моўчкі ў пастанове АК і АКК КП(б)В. Нам здаецца, што з усіх паданых фактаў вынікае, што ў далейшай рабоце па чystцы партыі ўсе партарганізацыі і праверкомы ў першую чаргу павінны мабілізаваць усе свае сілы, каб правесьці чystку яшчэ больш глыбока, яшчэ больш дасканала і сурова. Робячы ўпор на праверку клясавай лініі, мы тым самым забясьпечым сябе ад магчымага паўтарэньня такіх гісторый, калі праз некаторы час пасьля чысткі выкрываюцца «букеты» ўсялякіх апартуністычных спраў у праверaных партарганізацыях.

Адзначаючы памылкі праверкомаў, нельга ня спыніцца на асобных спробах апаганеньня чысткі. Хоць гэтыя факты неадзіночныя, аднак, на іх трэба спыніцца, каб на гэтых прыкладах лішні раз падкрэсьліць асноўныя задачы праверачных камісій.

У Бабруйску пры праверцы ячэйкі пошты старшыня праверкому задаў аднаму партыйцу такое пытаньне:

— Як жывяцё палавым жыцьцём?

Прэзыдыум АКК безадкладна і рашуча рэагаваў на гэты недапушчальны факт. Старшыня праверкому быў заменены другім таварышом. Быў скліканы спэцыяльны сход ячэйкі, дзе на даным канкрэтным факце АКК завастрыла ўвагу партыйцаў і беспартыйных на недапушчальнасьці апаганеньня чысткі.

У Гомелі пры чystцы ячэйкі ЦРК партыйцам, што праявраліся, задавалісьі такія пытаньні: «Чаму разьвёўся з першай жонкай». У Віцебску пры праверцы аднэй савецкай ячэйкі праверком дапусьцілі грубыя палітычныя памылкі. Праверачная камісія на чале з тав. Міхайлавым праводзіла работу «паволі хваляў». Пытаньні, спрэчкі праходзілі без кіраўніцтва з боку праверкому. У выніку праверком дапусьцілі апаганеньне чысткі. Аднаму таварышу пашлякі дробна-буржуазнага тыпу задалі пытаньне:

— На якой падставе з пункту погляду партэтыкі таварыш дазваляе сабе мыцца з жонкай у аднэй лазьні.

І старшыня праверкому спакойна дазваляе таварышу, што праходзіць праверку, адказваць на гэта пытаньне. Праверком у даным выпадку пашоў па лініі апаганеньня чысткі да ступені хуліганскай бульварчыны.

Праверачныя камісіі павінны пільна сачыць за тым, каб іх работа была на вышыні сапраўдных палітычных задач генэральнай чысткі партыі і ні ў якім выпадку не дапускаць прыніжэньня гэтых задач і тым больш апаганеньня чысткі.

М. З.

СТАЎКА НА „ЗДАРОВАГА" ПРЫВАТНІКА І КУЛАКА

Асобныя камуністы, адназныя працаўнікі—кіраўнікі мазырскіх гандлёва-каапэрацыйных устаноў—праводзілі шкодную права-апартуністычную лінію, бралі стаўку на «здаровага» прыватніка і кулака. Наглыя праявы вўрэйскага шавінізму.

Бюро парт'ячэйкі гандлёва-каапэрацыйных устаноў не рэагавала на гэтыя факты і прымірэнча адносілася да канкрэтных праў правага ўхілу.

Ячэйка аб'яднае 17 гандлёва-каапэрацыйных устаноў і арганізацый. Здаецца, што ячэйка павінна была мабілізаваць усе свае сілы, каб забясьпечыць выразнае праявдзеньне правільнай лініі ў практыцы гэтых арганізацый.

На жаль, гэтага ячэйка не зрабіла. У радзе гандлёва-каапэрацыйных арганізацый скажалася правільная лінія і праводзілася няправільная палітыка. Сампрамсаюз і ЦРК бралі стаўку на «здаровага» прыватніка, на нэпмана і кулака, у апараце ЦРК выкрыты абураючыя скажэньні, якія мяжуюцца са злачынствамі. Камуністыя, члены ячэйкі, якія кіравалі гэтай установай, праводзілі ў сваёй рабоце яўна права-апартуністычную лінію. Цэлы рад фактаў скажэньня лініі партыі выкрыты ў практыцы аддзяленьня Дзяржгандлю. На чале аддзяленьня Дзяржгандлю стаяў правы апартуністы, партыец Фінкельштэйн, які настойліва абараняў інтарэсы прыватнага капіталу. Бюро ячэйкі на гэта не рэагавала і не вяло барацьбы з канкрэтнымі праявамі правага апартунізму.

Засьмечанасьць складу ячэйкі прывяла да таго, што ў ячэйцы расквітнелі ідэалёгічна шкодныя настроі, яўрэйскі шавінізм. Група камуністых-яўрэяў, членаў ячэйкі, адкрыта выказвала яўна шавіністычныя погляды. Бюро ячэйкі не мабілізавала партыйцаў на барацьбу з шавінізмам і антысэмітызмам, які расквітнеў у апараце ЦРК, і ня ўдарыла па групе яўрэйскіх шавіністых. Самакрытыка ў ячэйцы і ва ўстановах не разгорнута — ёсьць факты заціску самакрытыкі.

Праверачная камісія рашуча выкрыла ўсе недахваты. 12 чал. з партыі выключаны. Такая вялізная колькасьць выключэньняў сьведчыць аб тым, наколькі ячэйка была засьмечана. Выключаны з партыі: старшыня Мазырскага ЦРК Шэйнман за сувязь з клерыкаламі, права-апартуністычную дзейнасьць і скажэньне клясавай лініі; Ліўшыц, які ў мінулым быў буйным спэкулянтам; завадчык аддзяленьня Дзяржгандлю, Фінкельштэйн, які крэдытаваў прыватнікаў, за рахунак Дзяржгандлю рамантаваў прыватныя заводы і хадайнічаў перад фінансавымі органамі аб зьніжэньні падаткаў з нэпманаў і г. д. 17 партыйцаў атрымалі суровыя партспагнаньні.

Чystка, якая працягвалася 10 дзён, прайшла пры актыўным удзеле беспартыйных рабочых і работніц, пры шырокім разгорнутай самакрытыцы, ня гледзячы на асобы.

Гэта дапамагло праверкому выявіць сапраўднае становішча парт'ячэйкі. Ячэйка ў выніку чысткі будзе аздароўлена.

М. ВАПЕЛЬНІК.

САМАКРЫТЫКА НЯ БЫЛА РАЗГОРНУТА

Ячэйка несваячасова і слаба змагалася з бюракратызмам, падхалімствам і скажэньнямі клясавай лініі

У практыцы судовых і сьледчых органаў, якія аб'ядноае ячэйка, мелі месца скрыўленьні клясавай лініі, былі праявы правага апартунізму. Ячэйка Наркамюсту праходзіла міма гэтых фактаў.

Ячэйка не рэагавала на права-апартуністычную палітыку, якую праводзіла кіраўніцтва Асобнай Калегіі Вышэйшага Кантролю. Член партыі **Зыбко**, які на працягу 4 год працаваў у АКВК, прымірэнча адносіўся да «лініі» Лабаноўскага. У ячэйцы, на сходах, тав. Зыбко заўсёды галасаваў за рашучую барацьбу з правым ухілам і прымірэнцтвам, а на практычнай рабоце ён ганебна цягнуўся ў хвасьце ў Лабаноўскага. Замест таго, каб сыгналізаваць партыі аб скрыўленьнях клясавай лініі ў АКВК, замест рашучага выкрыцьця сапраўднага твару Лабаноўскага, т. Зыбко аб'ектыўна дапамагаў яму ў правядзеньні кулацкай палітыкі.

Потым, калі т. Зыбко стаў старшынёй АКВК, ён ня здолеў выправіць свае памылкі. Замест выразнага праявдзеньня клясавай лініі, т. Зыбко розныі спосабамі манэўраваў пры разглядзе тэй ці іншай зямельнай справы. Праверачная камісія зрабіла зусім правільна, калі вынесла тав. Зыбко суровую вымову з папярэджаньнем і прапанавала зьняць яго з пасады старшыні АКВК.

Асобныя скрыўленьні клясавай лініі мелі месца і ў практыцы работы акрсуду, пракуратуры, Вярхоўнага суду. Так, пракуратура рэспублікі чрыньняе продаж дому буйнога падрадчыка Лапірава, які не заплаціў 17.000 руб. падатку. Яшчэ больш: пракуратура нават настойвала на прыцягненьні да крымінальнай адказнасьці прадстаўнікоў Гомельскага акрфа за продаж гэтага дому.

Літара, форма перамагала часамі рэвалюцыйную законнасьць у радзе асобных спраў, якія разглядаліся Вярхоўным і акруговым судамі. Ячэйка-ж не завастрала сваёй увагі вакол гэтага.

У апараце Наркамюсту доўгі час панаваў заціск самакрытыкі. Крытыкаваць можна было толькі гледзячы на асобы. Ніхто з супрацоўнікаў не адважваўся крытыкаваць былога старшыню акрсуду Карначова, які сыстэматычна п'янстваваў і разбураў работу апарату. Ды ня толькі супрацоўнікі. Нават бюро і ячэйка ў цэлым не рэагавалі на гэтыя абураючыя зьявішчы.

Характэрны факт: на сходзе па чystцы савецкага апарату аднаму з працаўнікоў суду не далі выказацца па кандыдатуры намесьніка Наркамюсту тав. **Гохмана**. Бюро ячэйкі на сваім пасяджэньні абмяркоўвае пытаньне: быў ці ня быў тут заціск самакрытыкі? І прыходзіць да выводу: «Суб'ектыўнага заціску ня было, а аб'ектыўна заціск усё-ж іспаваў». Гэты факт харакгарызуе, як замест рашучага і глыбокага ўкараненьня самакрытыкі, бюро ячэйкі займалася зусім нікчэмнымі пытаньнямі.

Пры праверцы высьветлілася, што асобныя адказныя працаўнікі суду члены партыі трымалі цесную сувязь з чужым варожым элемэнтам. Праверком выключыў з КП(б)В двух такіх таварышоў (**Шыфрын, Фэйгін**).

Адсутнасьць самакрытыкі ў Наркамюсьце спрыяла разьвіцьцю бюракратызму падхалімства і пратэкцыянізму ў судова-сьледчых органах. Былі выпадкі калі судовыя справы зацягваліся ад 4-х да 7 год. Так, справа нейкай **Грышынай** цягнецца з 1922 году, справа аб звальненьні настаўніцы Хлябдзэвіч разглядалася 12 раз, справа на іску домаўладальніцы Рэкс да рабочага Ліпніцкага разглядалася ў розных судовых інстанцыях ні больш, ні менш, як... 30 раз і г. д.

Праверком вынес суровую вымову партыйцу **Кіпарысаву** за падхалімства.

Ячэйка мала цікавілася палітычным выхаваньнем партыйцаў. Чystка выявіла поўную палітычную нішэмненасьць асобных адказных партыйцаў. Многія з гэтых таварышоў вучацца ў БДУ і пад ярлыком «студэнтаў» унікаюць ад палітвучобы ў гуртках і партшколах.

З 44 праверaных 4 выключаны з партыі і 15 атрымалі розныя партыйныя спагнаньні. Ячэйка павінна ўлічыць усе прапановы, якія ўнесены праверачнай камісіяй і выправіць усе памылкі, што мелі месца ў рабоце ячэйкі да гэтага часу.

С.

Трэба перабудаваць жыцьцё нашых ВНУ

Мы знаходзімся ў сучасны момант на грабяні вялізарнай бытавой рэвалюцыі, што абумоўліваецца пераходам краіны на бесьперапынную вытворчасьць і выцякаючай адсюль новай каляндарнай сыстэмай.

Савецкія ВНУ, перад якімі зараз стаяць выключныя задачы стварэньня пралетарскіх кадраў кваліфікаваных спэцыялістых, абавязаны перабудаваць увесь тэмп свайго жыцьця, у адпаведнасьці з тэй бытавой рэвалюцыяй, аб якой мы гаварылі. Ажыцьцяўляемы ў сучасны момант нашымі ВНУ пераход на пяціднёўку гэтай задачы зусім не вырашае. Тое, што мы зараз робім, гэта толькі фармальны перавод, пры якім кожны факультэт працуе чатыры дні і абрывае сваю работу на пяты дзень. Гэта далёка не бесьперапыннасьць, якая патрабуецца ад вышэйшай школы рэканструкцыйным пэрыядам савецкай гаспадаркі і культуры. Нам патрэбен не фармальны, а сапраўдны пераход на бесьперапынную работу ВНУ. Гэтага пераходу не ажыцьцявіць пры сучасной сыстэме акадэмічнага году з яго дзьвюма сэстравым падзяленьнем і канікуламі. Гэту сыстэму трэба зьнішчыць і стварыць у нашых ВНУ такі акадэмічны год, які дазволіць зрабіць работу ва ВНУ бесьперапынным, які дазволіць ВНУ разьвіць тэмп жыцьця, адпаведна ўсяму тэмпу нашага сучаснага існаваньня, тэмпу індустрыялізацыі ўсёй савецкай эканомікі.

Як пабудаваць такі акадэмічны год?

1. Ён павінен ахапляць цалкам увесь астранамічны год з устанаўленьнем двух перапынкаў, якія скарыстоўваюцца для адпачынку студэнцтва і работнікаў, а таксама для рамонту памяшканьняў і інвэнтару, арганізацыйнага наладжаньня дапаможных устаноў і г. д. Перны перапынак—зімовы, працягам у два тыдні. Другі—летні, тэрмінам у адзін месяц.

2. Абумоўлены паказанымі вышэй прынцыпамі фактычны працяг заняткаў складае 10½ месяцаў, якія разьбіваюцца на тры аднолькавыя трымэстры па тры з паловаю месяцы кожны.

3. Увесь акадэмічны год будуецца па прынцыпе суровага спалучэньня і чаргаваньня заняткаў ва ВНУ з бесьперапынным вытворчай практыкай па-за ВНУ. Апошняя арганізуецца ў суадпаведнасьці са спэцыфічным характарам факультэту або аддзяленьня і вытворчай базай практыкі (напрыклад, дзень у пяціднёўку, пяціднёўка ў месяц, трымэстр у год і г. д.).

4. Кожны аднагадовы курс будуецца такім чынам, каб быць пройдзеным на працягу ня больш двух трымэстраў, прычым курсы кожнага выкладчыка ўкладваюцца ў адны і тыя-ж трымэстры. Вось тыя асноўныя прынцыпы, па якім ВНУ будуць мець магчымасьць рэалізаваць бесьперапыннасьць, якая зараз ажыцьцяўляецца толькі фармальна, з прычыны чаго яна наўрад ці прынясе патрэбную эфэктнасьць.

Якія-ж пераважнасьці прапанаваных намі мерапрыемстваў?

Перш за ўсё, у тым, што яны даюць нам сапраўды бесьперапынны акадэмічны год. Пры акадэмічным годзе ў дзесяць з паловаю месяцаў фактычнай вучобы, інтэнсыўнасьць заняткаў павінна моцна павысіцца, што дасьць у большасьці выпадкаў магчымасьць скараціць тэрміны навучаньня ў ВНУ і, значыцца, паскорыць атрыманьне дзяржаваю патрэбных спэцыялістых.

Важнейшым вынікам праектаванага пабудаваньня навучальнага году зьяўляецца магчымасьць разгарнуць належным чынам бесьперапынную вытворчую практыку. Ва ўмовах існуючага зараз акадэмічнага году вытворчая практыка або ідзе за лік навучальных заняткаў або ажыцьцяўляецца ўсячаным чынам. Наш праект дазволіць унікнуць і таго і другога.

Нарэшце, пры тым пабудаваньні акадэмічнага году, якое намі прапануецца, кожны навуковы работнік павінен будзе два трымэстры займацца выкладаньнем, а трэці трымэстр аддаць на навуковую працу, аб якой яму прыдзецца рабіць справаздачу ўстаноўленым парадкам. Гэта акалічнасьць, бясспрэчна, самым спрыяючым чынам адаб'ецца на падняцьці кваліфікацыі навуковых работнікаў, пытаньне, якое стаіць у нас, у Беларусі вельмі востра, я-б сказаў—пагражаюча.

Практычнае ажыцьцяўленьне чашага праекту можа наткнуцца на рад перашкод тэхнічнага парадку. Сярод іх, як нам здаецца, няма ні адной, якая магла-б аказацца непераможнай. Гэтае ажыцьцяўленьне патрабуе пакаторага, адносна невялікага, павялічэньня бюджэту ВНУ, але гэты выдатак з лішкам пакрыецца выгодамі, якія дзяржава атрымае дзякуючы інтэнсыфікацыі жыцьця ВНУ і паскарэньня выпуску спэцыялістых. Вось чаму я лічыў патрэбным вынесьці гэтыя прапановы на абгаварэньне шырокіх мас навуковых працаўнікоў і студэнцтва, таксама і зацікаўленых ведамстваў, у першую чаргу Наркамасьветы.

Калі гэтыя прапановы будуць прынятыя, трэба будзе тэрмінова прыступіць да перабудовы навучальных плянаў з пункту погляду ўсіх ВНУ БССР з такім разьлікам, каб з новага акадэмічнага году ўся работа вышэйшай школы Беларусі была пабудавана пановаму. Час не чакае! Вакол перабудовы вышэйшай школы трэба мабілізаваць думку савецкай грамадзкасьці! Трэба зьмяніць доўгія, марудныя абломаўскія тэмпы тэмпам сацыялізму, які бурна будуецца!..

С. Я. ВАЛЬФСОН.

Перавыбары дэлегатак

Дапамаглі гарсавету

Спачатку да Менскага гарсавету было прымацавана 180 дэлегатак. Акрамя гэтага было пакінута 27 дэлегатак, якія актыўна працавалі ў мінулым складзе гарсавету. Трэба канстатаваць, што ня ўсе дэлегаткі ўзяліся за работу, але значная частка з іх (140 чал.) прыняліся за работу і практычна дапамагалі гарсавету, выконваючы шмат даручэньняў. Дэлегаткі прымалі ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах, якія праводзіў савет. Досыць паказаць, што за 1928-29 год дэлегаткі правялі звыш 4.000 абсьледваньняў па біржы працы. Пасьля абсьледваньня ёсьць вынікі, бо па гэтых абсьледваньнях зьнята з вучоту біржы працы да 800 чал.

Другую больш важную работу, якую правялі дэлегаткі — па абсьледваньні асоб, запісаных у чаргу ў жылстале для атрыманьня жыллоашчы, а таксама выяўленьне 30-процантнай нормы ў прыватных дамох. Ёсьць асобныя дэлегаткі, якія абсьледвалі ад 400 да 500 кватэр і, паводле даных жыластала, зьнята з чаргі да 500 асоб, на якіх дэлегаткі далі сваё заключэньне. Магчыма было правесьці рад мерапрыемстваў, якія праведзены сіламі сэкцыі савету, дзе найбольш актыўны ўдзел прымалі дэлегаткі, як абсьледваньне жактаў, дзіцячых дамоў, зьсьлі, абсьледваньне асоб, якія атрымліваюць дапамогу ад Гарадскога камітэту беднаты і шмат заданьняў па лініі ўсіх сэкцый.

Трэба канстатаваць значную актыўнасьць дэлегатак на пленумах сэкцый гарсавету. Няма ніводнага пасяджэньня пленуму сэкцыі гарсавету, дзе ў спрэчках ня выступалі-б дэлегаткі. Процант наведваньня пленумаў сэкцый зусім невыстарчальны, які ў сярэднім складае 45 проц. Аб гэтым жанадзелам і дэлегацкім сходам трэба будзе з новымі дэлегаткамі правесьці вялікую працу, каб новыя дэлегаткі лепш наведвалі сэкцыі. Невыстарчальнае было з боку гарсавету і жанадзелу інструктаваньне дэлегатак і растлумачэньне парадку працы прымацаваных да гарсавету. Невыстарчальнае было разьмеркаваньне нагрузкі паміж дэлегаткамі і разьмеркаваньне іх на сэкцыях. Значны адсеў прымацаваных дэлегатак ставіць задачу перад дэлегацкімі сходамі, каб паогул прымацаваньне палепшылася. Прымацаваць да гарсавету трэба толькі тых, якія хочуць працаваць, цікавяцца савецкім будаўніцтвам і змогуць прыняць актыўны ўдзел у штодзённай практычнай рабоце гарсавету.

Таму трэба не мэханічнае прымацаваньне, а ўцягваньне ў працу дэлегатак, якія дадуць практычную дапамогу ў сацыялістычным будаўніцтве.

ЭЙДЭЛЬМАН.

Трывожны сыгнал

МАГІЛЕЎ, (Наш кар.). Весткі з раёнаў аб ходзе перавыбараў дэлегатак сьведчаць аб нездавальняючым становішчы гэтае кампаніі. Многія райпартарганізацыі недаацанілі гэтае кампаніі і абмежаваліся толькі распрацоўкай плянаў, дачай дырэктыў ячэйкам. Падрыхтоўчая работа праведзена дрэнна, асабліва на мясцох. Некаторыя ячэйкі зусім не прапрацавалі гэтага пытаньня. Дырэктывы райкому спакойна ляжалі ў кішэнях сакратароў ячэек (Шылавіцкая ячэйка, Клімавіцкага раёну) і інш.

У Чырвонапольскім раёне партыйныя ячэйкі да гэтага часу яшчэ ня выпрацавалі плянаў кампаніі. Перавыбары праходзяць стыхійна, бяз усякага кіраўніцтва. У Прапойскім раёне ўся работа па праявдзеньні кампаніі ўскладзена на райжанарганізатара, актыў да перавыбараў ня прыцягнуты. Па пляне Лупалаўскага райкому КП(б)Б у кожным пункце павінен быць прадстаўнік ад райкому, але выпучаньня для гэтага таварышы няўважліва адносяцца да работы. Кампанія па раёне праходзіць дрэнна.

Перавыбары дэлегатак ня ўвязваюцца з хлебазагатоўкамі. Таварышы, якія праводзяць перавыбары, не скарыстоўваюць апошніх для прыцягненьня жанчын да ўдзелу ў гэтай важнейшай кампаніі.

АЛ. СЯНКЕВІЧ.

Там, дзе няма работы

(ЛОШЫЦА, МЕНШЧЫНА)

У **Лошыцкім** нардоме прыгараднага **сельсавету** адбыўся справаздачны сход дэлегатак. З 27-мі дэлегатак на сходзе прысутнічалі толькі 4, некалькі сялянак і жонак рабочых. Ужо самы гэты факт сьведчыць аб пасыўнасьці работы дэлегатак. І сапраўды, дэлегацкі сход мінулага складу ніякай работы не праводзіў.

Прымацаваная да сходу прадстаўнік райкому партыі тав. **Мажэйка** ніводнага разу ня склікала сходу. За цэлы год адбыліся толькі 2 сходы і тыя выпадкова, прысьвечаныя тэй ці іншай кампаніі. У выніку такой «работы» дэлегаткі ня ведаюць нават сваіх задач. На сходзе некаторыя з іх пыталіся: «Што такое дэлегатка? Для чаго нас выбралі, хто наш кіраўнік»?

Выхаваўчай работы сярод дэлегатак няма. Прымацаваньне да сэкцыі гарсавету, або сельсавету не праводзіцца. Большая частка дэлегатак нянісьменная, ніхто не паклапаціўся аб ліквідацыі нянісьменнасьці.

Прыгарадная парт'ячэйка глядзіць на работу сярод жанчын, як не на сваю справу, і ўскладае ўсю работу на жанарганізатара.

Райкому партыі трэба ўзмацніць кіраўніцтва дэлегацкім сходам у прыгарадным сельсавеце.

БАЧЫЎШЫ.

Упоўнаважаныя па распаўсюджваньні газ. «Зьвязда», прысылайце ў свой аддзел **„ЗЬВЯЗДА Ў МАСЫ"** допісы аб тым, як у вас праходзіць работа, якія ёсьць дасягненьні і недахопы, як выконваецца ў вашых лёзунгах «Ні аднаго партыйца, які-б не выпісаў «Зьвязду».

Па Савецкім Саюзе

Вялізарны посьпех 3-е пазыкі індустрыялізацыі

Пазыка дала на 1-га лістапада 812 міл. руб.

МАСКВА, 11. 10 лістапада ў Крамлі, пад старшынствам тав. КУТУЗАВА, адбылося чарговае паседжаньне Цэнтральнае Камісіі Садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадкай справы пры прэзыдыуме ЦВК СССР. На паседжаньні было заслухана паведамленьне Наркамфіну СССР аб рэалізацыі 3-е пазыкі індустрыялізацыі.

НА 1-га ЛІСТАПАДА Ў СССР ПАДПІСАЛІСЯ НА АБЛІГАЦЫІ ПАЗЫКІ НА 812 МІЛ. РУБ. Сярод рабочых і служачых пазыка рэалізавана на 624 міл. руб., што складае 194 проц. заданьня, а ў вёсцы — 136 з палов. міл. рублёў, —57,4 проц. заданьня. НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ СТАІЦЬ УССР. Адстаюць Закаўказьзе і РСФСР, асабліва Чувашыя, Іванава-Вазьнясенская вобласьць, а таксама Ленінградзкая, Маскоўская і Ніжагародзкая вобласьць. Камісія рашыла зьвярнуцца зноў да ўраду Саюзу ССР з просьбаю паскорыць разгляд пытаньня аб павялічэньні агульнае сумы 3-е пазыкі індустрыялізацыі.

Пяцігодка будаўніцтва машынатрактарных станцый

МАСКВА. У савеце трактарацэнтру абгаворвалася пытаньне аб пяцігадовым пляне будаўніцтва машынатрактарных станцый. Старшыня праўленьня трактарацэнтру т. Кліменка прапанаваў савету зацьвердзіць праграму будаўніцтва 575 станцый, якія да канца пяцігодкі павінны мець 129.350 трактараў, і ахапіць 30 мільёнаў гэктараў пасеву. Раёны будаўніцтва станцый дадуць у 1932-33 годзе столькі таварнага хлеба, колькі зараз дае ўся сельская гаспадарка.

У спрэчках т. т. Мікаян, Кубяк, Квірынг, Калмановіч і інш. выказаліся за неабходнасьць пабудаваць на працягу пяцігодкі не 575, а тысячу станцый, з ахопам 40 мільёнаў гэктараў пахаці. Машынатрактарныя станцыі павінны мець 200 тысяч трактараў.

Савет выбраў камісію, якой даручана распрацаваць праграму пяцігадовага будаўніцтва тысячы машынатрактарных станцый.

Ленінградзкія тэкстыльшчыкі падпісалі дагавор па сацспаборніцтве з бавоўнаводамі Сярэдняе Азіі

ЛЕНІНГРАД, 10. У доме культуры тэкстыльшчыкаў адбылося ўрачыстае падпісаньне дагавору па спаборніцтве і шэфстве паміж тэкстыльшчыкамі Ленінграду і бавоўнаводамі Сярэдняй Азіі. Абодва бакі абавязаліся выканаць пяцігадовы плян сваіх галін і вызваліць тэкстыльную прамысловасьць з-над замежнае залежнасьці. Тэкстыльшчыкі пры гэтым абавязаліся к канцу 1932 г. павялічыць выпуск прадукцыі на 92 проц., падняць прадукцыйнасьць працы на 110 проц., зьнізіць сабекошт прадукцыі на 35 проц., палепшыць якасьць і г. д.

Дэкхане, батракі і інжынэрна-тэхнічны пэрсанал бавоўнаводных раёнаў, рабочыя бавоўняных і маслабойных заводаў з свайго боку абавязаліся цалкам забясьпечыць тэкстыльную прамысловасьць савецкай бавоўнаю, пашырыць пасеўную плошчу на 98 проц., падняць урадлівасьць у 1929-30 годзе на 15 процантаў, а к канцу пяцігодкі — на 40 проц.; павялічыць плошчу бавоўняных саўгасаў да 200 тысяч гэкт., цалкам мэханізаваць апрацоўку глебы

Філёзофскія карэньні правага ўхілу

Ленін многа раз адзначаў непарыўную сувязь марксыцкай філёзофіі з палітыкай. Ён паказваў, што «марксыцкая філёзофія — дыялектычны матэрыялізм — зьяўляецца асновай марксызму, навуковым мэтадам і кіраўніцтвам для рэвалюцыйнага дзеяньня». На падставе матэрыялістычнай дыялектыкі Маркс дасканала вывучаў сутнасьць і законы капіталістычнага грамадзтва і даказаў нямінучую пагібель апошняга. Кіруючыся навукай марксызму, пралетарыят усьвядоміў сваё гістарычнае прызначэньне і здолеў намеціць сродкі і шляхі для ўласнага вызваленьня і вызваленьня прыгнечаных працоўных мас ад эксплёатацыі, для рэвалюцыйнага перавароту, для пераходу да камуністычнага грамадзтва.

Ленін заўсёды патрабаваў у галіне філёзофіі строгай партыйнасьці і непрымірымасьці да розных апартуністычных скажэньняў. Рэвізіянізм у абсягу марксызму німнуча вядзе да апартунізму ў абсягу палітыкі. Калі Бэрнштэйн у канцы мінулага стагодзьдзя пачаў рэвізаваць навуку Маркса, ён скаціўся да апартунізму і зараз зьяўляецца самым заядлым правадыром сацыял-фашыстых нямецкай здрадніцкай сацыял-дэмакратыі. І гэта робіцца з кожным, хто прабуе так ці інакш скажаць марксызм-ленінізм. У апошнія часы апартунізм Троцкага прывёў яго ў лягер сьмяротных ворагаў Савецкага Саюзу. На рэвізіяністкіх пазыцыях зараз стаяць і правыя ўхілістыя.

У палітыцы мае выключнае значэньне правільнае разуменьне і правільнае ўжываньне дыялектычнага матэрыялізму. Вось гэтага якраз і няма ў правых апартуністых.

Ленін адзначаў, што важнейшым прынцыпам дыялектычнага матэрыялізму зьяўляецца — адзінства процілегласьцей і самарух, у працэсе якога адна процілегласьць ператвараецца ў другую. Ня гледзячы на тое, што Пляханаў шмат працаваў над праблемай дыялектычнага матэрыялізму, ён, як сьцьвярджае Ленін, не заўважыў самага галоўнага — раздваеньня адзінага.

Сацыялістычнае спаборніцтва

Праверачныя брыгады ў рады перадавікоў спаборніцтва

Рабочыя, якія праводзілі праверку гаспадарча-палітычных дагавароў, будуць актыўнымі арганізатарамі спаборніцтва ў цэху

На лесазаводзе «Калектыўная Праца», Гомельскае акругі, 5 брыгад у ліку 64 чалавек па праверцы сацыялістычнага дагавору скончылі сваю працу. На абдыўшайся нарадзе брыгадзіры пастанавілі, што праверачных брыгад не распускаць, а арганізаваць з іх ударныя брыгады. Усе брыгадзіры цяпер будуць у радах перадавікоў сацыялістычнага спаборніцтва. Яны, як удзельнікі праверкі гаспадарча-палітычных дагавароў, будуць лепшымі і сьвядомымі рабочымі па арганізацыі спаборніцтва ў цэху.

Праф'ячэйкі і партарганізацыі другіх заводаў павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на гэты прыклад брыгадзіраў заводу «Кал. Праца» і накіраваць актыўнасьць брыгадзіраў на сваіх прадпрыемствах на скарыстаньне такога важнага пачыну.

Паляпшайце якасьць кіраўніцтва

Лесазавод «Калектыўная Праца» (Нова-Беліца, Гом. акруга) яшчэ ў сакавіку месяцы заключыў дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва з барысаўскім лесапільным заводам «Камінтэрн». З 14-га верасьня была распачата праверка выкананьня саддагавору. Было арганізавана 5 брыгад (у кожным цэху па 1 брыгадзе), у якія ўвайшло 64 дабраахвотнікі. Брыгады былі падзелены на невялічкія групкі (па 3-4 чал.), для вывучэньня ходу сацспаборніцтва ў кожнай галіне вытворчасьці. Зараз ужо ёсьць магчымасьць падагуліць вынікі сацспаборніцтва.

Так, у лесапільным цэху праграма выканана толькі на 98 проц. Гэта тлумачыцца тым, што на працягу году ў працы заводу было шмат перабояў і прастояў на прычыне неспраўнасьці саматаса і перасілавой устаноўкі. Сабекошт расьпіловкі драўніны павялічыўся на 3,85 проц. у параўнаньні з плянам. Прадукцыйнасьць працы перавысіла заданьне на 9,55 проц., дзякуючы частковаму ўпчыльненьню рабочага дня і рацыяналізацыі працэсаў вытворчасьці.

У бачарным цэху выпуск прадукцыі ў параўнаньні з плянам павялічыўся на 5,33 проц., але за тое сабекошт прадукцыі таксама павялічыўся на 0,8 проц. У гэтым павялічэньні сабекошту вінавата адміністрацыя, якая своечасова не заготовіла сырцу, дзякуючы чаму прыпынялася скарацыць работу цэлае зьмены. Па гэтай прычыне часта прыходзілася плаціць рабочым за прастоі (20 чалавекам).

У стружкавым цэху стружкі выпрацавана больш праграмы на 74,76 проц. Гэта ліцба дасягнута, дзякуючы пераходу стружкавага цэху на 2-х зьменавую работу. Прадукцыйнасьць працы па цэху ў выніку сацспаборніцтва павялічылася на 21,8 проц.

У сучасны момант брыгады па праверцы гаспадарча-палітычнага дагавору скончылі сваю работу і на сваёй нарадзе пастанавілі арганізаваць ва ўдарныя брыгады і пачаць працу па зьнішчэньні недахопаў, якія выявіліся ў часе праверкі.

Трэба сказаць, што заводзкія органы, як заводакіраўніцтва, заўком і ячэйка, слаба кіравалі работай сацыялістычнага спаборніцтва, а таму ёсьць рад пунктаў пляну, якія ня выкананы па асобных галінах вытворчасьці.

На вялікі сорам, не адзін раз склікаўся агульны сход рабочых, на якім павінна была стаяць справаздача заводакіраўніцтва і часовай кантрольнай камісіі аб ходзе сацыялістычнага спаборніцтва, і ні разу гэты сход не адбыўся. Пэрыядычныя табліцы аб ходзе спаборніцтва амаль ня вывешваліся (хаця для гэтага і былі прыбіты спэцыяльныя дошкі), а калі табліцы ў рэдкіх выпадках і вывешваліся, то рабочым яны былі зусім не зразумелы.

Як ідзе спаборніцтва на заводзе «Камінтэрн», з якім наш завод спаборнічае, рабочыя аб гэтым і да гэтага часу ня ведаюць. Насьценгазэта зусім мала ўдзяляла ўвагі ходу спаборніцтва, бо яна мае зусім нязначную колькасьць карэспандэнтаў. Насьценгазэта запаўняецца толькі двума «штатнымі» сьценкорамі, якія пішуць па заданьні. Акрамя гэтага, партыйная ячэйка амаль ня кіруе работай рэдкалегіі.

Клюб, які павінен актыўна дапамагаць у справе разгортваньня сацспаборніцтва, з сваёй задачай зусім не справіўся. Культкамісія таксама.

Аднэй з прычын слабога ўдзелу рабочых у працы вытворчых камісій і вытворчых нарад часткова яшчэ зьяўляецца і тое, што заводакіраўніцтва падчас нячула адносіцца да прапаноў рабочых. На заметкі, якія зьмешчаны ў насьценгазэце, дырэкцыя ня лічыць патрэбным адказваць.

Вось тыя хібы, якія маюцца на заводзе «Калектыўная Праца» і перашкаджаюць сацспаборніцтву.

Зьнішчыць гэтыя недахопы можна толькі пры тых умовах, калі будзе палепшана кіраўніцтва як з боку прафарганізацыі, так і парт'ячэйкі.

І. Маркаў.

Хто тармозіць сацспаборніцтва

Праверка дагавароў па сацспаборніцтве выяўляе, што многія гаспадарнікі ня толькі не дапамагаюць сацспаборніцтву, а наадварот, усімі мерамі тармозяць гэту справу. Вось прыклады:

Загадчык вытворчасьці фабрыкі «Спартак» (Шклоў) тав. Русакін заявіў, што «ф-ка даволі нагружана, таму ня трэба праводзіць спаборніцтва».

Начальнік 2-й дыстанцыі пабудовы чыгункі «Росмодор» т. Рак у адказ на прапановы ўступіць у спаборніцтва заяўляе: «я і так шмат працую, таму мне няма чаго ўступаць у спаборніцтва».

Дырэктар заводу «Адраджэньне» (Магілеў) т. Добкін сядзеў у сваім габінэце ўвесь час, пакуль праходзіў сход рабочых па правядзеньні вынікаў сацспаборніцтва. Толькі калі сход скончыўся і пачалі выходзіць з памяшканьня, дырэктар вышаў са свайго габінэту і на пытаньне, чаму ён ня быў на сходзе, адказаў: «у мяне былі больш важныя справы, прыехаў прадстаўнік з трэсту».

Аб Добрускім будаўніцтве і аб удзеле кіраўнічых арганізацый гэтага будаўніцтва ў сацспаборніцтве пісалася ўжо ў «Зьвязьдзе». Але гэта мала ўплывае на кіраўнікоў. Ужо пасьля гэтага для «стымуляваньня» падняцьця прадукцыйнасьці працы адміністрацыя і старшыня рабачкому ўстанавілі такія правілы: за забіўку першых трох паляў 4 руб., а за забіўку 4-га і 5-га палю—5 руб. 50 к., прычым гэта расцэнка нідзе не абгаворана—ні ў РКК, ні на пасяджэньнях рабачкому і не растлумачана рабочым. У выніку—штодзённыя скандалы і асобныя выпадкі адмаўленьня рабочых ад гэтай працы. На гэтым-жа будаўніцтве рабачком 17-га кастрычніка атрымаў заяву ад 22-х рабочых-цесьляроў аб іх жаданьні арганізаваць ударную брыгаду, якая бярэцца падняць прадукцыйнасьць працы на 15 проц. і зьнізіць расцэнкі на 5 проц. Для распрацоўкі паказальнікаў і дагавору быў накіраваны ад адміністрацыі будаўніцтва прараб Васіленка, які прышоў і перш-на-перш пачаў угаворваць рабочых, што нямэтазгодна арганізоўваць ударныя брыгады. Толькі пасьля рашучага адпору брыгадзіра ЦСПСБ, прараб Васіленка прыняў удзел у распрацоўцы дагавору, але пасьля распрацоўкі катэгарычна адмовіўся падпісаць гэты дагавор пад агаворкай, што трэба ўзгадніць з канторай. Так ён «узгадніе» і да гэтага часу і дагавор не падпісаны.

Усё гэта выразна сьведчыць аб тым, што многія гаспадарнікі зусім не зразумелі сутнасьці сацспаборніцтва, не вразумелі і ня ведаюць нічога аб тым, якую-ж ролю павінна адыгрываць адміністрацыя пры правядзеньні сацспаборніцтва.

Трэба рашуча патрабаваць ад усіх гаспаданікаў актыўнага ўдзелу ў гэтай працы. Выпадкі абыякасьці і тармажэньня рабочай ініцыятывы з боку гаспадарнікаў павінны быць зжыты.

М. Ш.

Адкрываюцца новыя індустрыяльныя тэхнікумы

Прэзыдыум Дзяржпляну на апошнім пасяджэньні зацьвердзіў план арганізацыі ў БССР новай сеткі індустрыяльных тэхнікумаў. Намячаецца на працягу 3-х год адкрыць тэхнікум запалкавай вытворчасьці з мэхэнічным і хімічным аддзяленьнямі ў Барысаве, тэкстыльны тэхнікум з ільнапрадзільным, тэкстыльным і галянтарэйна-трыкатажным аддзяленьнямі ў Воршы, будаўнічы тэхнікум з геолёгічна-разведачным аддзяленьнем у Магілеве, вячэрняе аддзяленьне пры будаўнічым тэхнікуме ў Менску, тэхнікум па дрэваапрацоўцы ў Бабруйску, аддзяленьне радыётэхнікаў пры політэхнікуме ў Віцебску, аддзяленьне па сельска-гаспадарчым машынабудаўніцтве пры Індустрыяльным тэхнікуме ў Віцебску, аўтатрактарны тэхнікум з вячэрнім аддзяленьнем у Гомелі, саматужны тэхнікум у Магілеве і швэйны тэхнікум у Менску. Тэрмін навучаньня разьлічаны на 3—4гады. На першыя курсы будзе прынята каля 700 чалавек. Тэхнікумы павінны быць адкрыты на працягу 1930-33 г. г.

Праф'ячэйкі, якія зьяўляюцца шырмамі спаборніцтва

Праверку ходу сацыялістычнага спаборніцтва на прадпрыемствах Гомельшчыны выявіла, што саюзныя арганізацыі яшчэ не павярнуліся тварам да вытворчасьці. Нізавыя праф'ячэйкі і нават асобныя акраддзяленьні саюзаў працуюць пастарому: чакаюць абежнікаў ад вышэйшых органаў.

На заводзе «Пралетары» лепшыя рабочыя заводу, за якімі няма на працягу 5-6 год прагулаў і спазьненьняў, першыя ўступілі ў сацспаборніцтва і пачалі выклікаць рабочых розных цэхаў. У цэхах стварыліся ўдарныя брыгады, заключаліся дагаворы паміж асобнымі рабочымі, даваліся каштоўныя прапановы аб зьнішчэньні недахопаў у вытворчасьці. Многія групы рабочых зьнізілі расцэнкі. Брыгада сьлесароў па зборцы раствора - мяшалак паступова зьнізіла расцэнкі з 225 рублёў да 100 руб.

А фабком і адміністрацыя стаяць у баку ад сацспаборніцтва. Вось характэрныя факты. 12-га жніўня фабком атрымаў выклік рабочых заводу «Камінтэрн» (Віцебск) на сацспаборніцтва. Заўком гэты выклік без абмеркаваньня перадаў вытворчай камісіі, якая да гэтага часу не дала адказу рабочым заводу «Камінтэрн». Такі лёс спаткаў выклік рабочых Менскага заводу «Энэргія». Рабочыя нават ня былі інфармаваны аб гэтых выкліках.

Дагавор медна-ліцейнага цэху з арматурным застаўся неаформленым, і заўком выкрыў гэту справу толькі ў часе праверкі. Адна зьмена паліроўшчыкаў зрабіла выклік другой зьмене. Тая адказала, што выклік прымае, але паколькі хутка будзе надыходзіць водпуск, то дагавор будзе заключаны пасьля водпуску. Паперка захавана падпытай у справах заўкому. Прайшло шмат часу, але дагавор застаўся не заключаным. Заўком зусім забыўся пра яго.

Аб гэтых недахопах ведала акраддзяленьне саюзу. Яшчэ 20-га жніўня заўком паведаміў саюзу аб тым, што адміністрацыя парушае свае абавязацельствы. Прадукцыйнасьць працы зьнижаецца на 8 проц., брак павялічыўся да 50 проц. Сацспаборніцтва прыцихла.

Яно, абсьледаваўшы, як праводзіцца сацспаборніцтва на заводзе, не дало заўкому канкрэтных дырэктыў, непасрэдна для гэтага заводу, а абмежавалася толькі прысылкай агульнай рэзалюцыі, якая была прышыта «да справы».

Культкамісія заўкому не праяўляла належнай ініцыятывы, каб мабілізаваць рабочых вакол пытаньня сацспаборніцтва.

Ня ўсё добра і ў саюзе саўгандальслужачых. Праверка ходу сацспаборніцтва ў вялікім калектыве ЦРК выявіла досыць сумны малюнак. Дагаворы на спаборніцтва не афармляліся. Асобныя выклікі і праекты вялаліся па 2 месяцы ў групкоме і пасьля былі згублены. Супрацоўнікі нават ня ведаюць, з кім яны спаборнічаюць. У страхкасе пры заключэньні саддагавору з Бабруйскай страхкасай была адхілена прапанова аб арганізацыі грамадзкага кантролю за скарыстаньнем больнічных лісткоў. Між тым, грамадзкі кантроль узьнікае стыхійна. Рабочыя заводу «Рухавік Рэвалюцыі» перадаюць страхкасе сьпісы тых асоб, якія праз ашуканства атрымліваюць у страхкасе грошы. Адхіленьне гэтага кантролю было палітычнай памылкай.

Не дапускаць скажэньня ідэі прэміяваньня

ПРЭМІЯВАЦЬ У ПЕРШУЮ ЧАРГУ ЎДАРНЫЯ БРЫГАДЫ, ЛЕПШЫЯ ЦЭХІ І ГРУПЫ РАБОЧЫХ

Яшчэ ў жніўні 1928 г. прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў стварыць на прадпрыемствах фонды прэміяваньня за лепшыя вынікі па сацспаборніцтве. Фонды павінны складацца з адназовага адлічэньня прадпрыемствам у разьмеры 1/10 проц. гадавога фонду зарплаты і 15 проц. усёй эканоміі, атрыманай у выніку паляпшэньня працы прадпрыемстваў ад правядзеньня сацспаборніцтва. Пры вынясьненьні гэтай пастановы, прэзыдыум ЦСПСБ даў указаньне ўсім прафарганізацыям аб паляпшэньні падліку эканамічнага эфэкту сацспаборніцтва і аб сваячасовым скарыстаньні гэтых фондаў.

Зараз па ўсіх прадпрыемствах падагульваюцца вынікі дагавароў па сацспаборніцтве і ў некаторых прадпрыемствах праводзіцца ўжо разьмеркаваньне фонду прэміяваньня.

Як праходзіць гэтае разьмеркаваньне?

На фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна» (Варысаў) разьмеркаваньне прэмій выклікала вялікую зацікаўленасьць рабочых і работніц. Наведваньне гэтага сходу было такое вялікае, што многія рабочыя не зьмясьціліся ў памяшканьні і, не жадаючы ісьці дамоў, стаялі пад вокнамі. А на сходзе прадстаўнікі фабкому раздавалі каму хустку, каму «прымус», каму кавалак паркалю і г. д.

Па такім-жа прынцыпе разьмеркавалі фонд прэміяваньня і на заводзе «Чырвоная Зара» (Менск). Тут стварылі 6 прэмій. Тры пары бацінак, 1 мандаліну (!), адзін адрэз сукна на майткі, адзін абор твораў Леніна. На агульным сходзе рабочых гэтыя прэміі былі разьмеркаваны, прычым цікава, што беспартыйным рабочым раздалі прадметы спажываньня, а рабочаму-партыйцу далі абор твораў Леніна.

Такі напрамак у разьмеркаваньні фонду прэміяваньня трэба прызнаць скажэньнем ідэі прэміяваньня. Трэба фонд прэміяваньня скарыстаць у першую чаргу на прэміяваньне калектываў, ударных брыгад, цэхаў, груп рабочых і індывідуальнае прэміяваньне можна дапускаць толькі ў выключных выпадках, пры наяўнасьці асабліва выдатнай працы асобных рабочых на арганізацыі сацспаборніцтва, прычым прэміяваць трэба так, каб гэтая прэмія дапамагала далейшаму падняцьню кваліфікацыі, прадукцыйнасьці працы. Гэтага можна дасягнуць выдачай такіх прэмій, як тэхнічныя і політычныя бібліятэкі, прымацаваньне настаўніка для падрыхтоўкі ў навучальную ўстанову, прадастаўленьне магчымасьці паехаць у экскурсію на лепшае прадпрыемства, выдача такіх рэчаў, як храномэтр і г. д.

Аб гэтым ёсьць і дырэктывы ЦСПСБ. Але пасобныя нізавыя праф'ячэйкі займіліся індывідуальнымі прэміямі і такім самым распыляюць фонды прэміяваньня без асаблівай карысьці для сацспаборніцтва.

Такое зьявішча трэба зьнішчыць.

М. Ш.

На 15-га лістапада, а 10-й гадзіне раніцы склікаецца акруговая канфэрэнцыя груп беднаты Менскай акругі з наступнай абвесткай дня;

1. Пацігадовы плян разьвіцьця народнай гаспадаркі Саюзу і БССР в канкрэтным вызначэньнем задач для мясцовых арганізацый і ўстаноў.
2. Аб удзеле беднаты ў перавыбарах сельсаветаў і камітэтаў сялянскай узаемадапамогі.
3. Вынікі работы па рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і далейшыя задачы.

Канфэрэнцыя будзе праходзіць у памяшканьні акрыканкому (зала пасяджэньняў).

...трэба зварачацца ў агульную

Кулак яшчэ ня здаў хлебных лішкаў

ДАДАТКОВАЕ ЗАДАНЬНЕ ПА ХЛЕБАЗАГАТОЎКАХ ПА БССР ПАВІННА БЫЦЬ ВЫКАНАНА КУЛАЦКА-ЗАМОЖНАЙ ЧАСТКАЙ ВЁСКІ

Сурова пакараем вінаватых у нядбайным хаваньні хлеба і бульбы

Кулак схаваўся за плячыма беднаты

Сельсаветы Аршаншчыны скрыўлялі клясавую лінію

(Ад нашага аршанскага карэспандэнта)

Хлебазагатоўкі на Аршанчыне ў сэнсе выкананьня плянавых заданьняў прайшлі здавальняюча. Да 6-га лістапада заданьне акругай было выканана на 110,3 проц. Хлебазагатоўкі, ня гледзячы на выкананьне пляну з перавышэньнем, працягваюцца з тым-жа тэмпам. Але што датычыць правядзеньня клясавай лініі ў хлебазагатоўках, то можна пажадаць значна лепшага. **Гэты бок справы кульгае ў большасьці раёнаў акругі.**

Замест таго, каб пры дапамозе беднаты ўзяць лішкі хлеба ў кулакоў, новы мэтад хлебазагатовак на практыцы быў так скрыўлены, што ў большасьці сельсаветаў **кулак свае лішкі хлеба захаваў.** Хлебазагатоўкі выкананы, галоўным чынам, **за ліх беднякоў і сераднякоў. Кулак-жа здаў столькі-ж, колькі і беднякі.** Сельсаветы сьпяшаліся хутчэй правесьці хлебазагатоўкі, толькі-б выканаць плянавае заданьне, **правільнасьцю клясавай лініі ў хлебазагатоўках яны зусім ня цікавіліся.** Так, заданьні, якія былі даны вёскам, не абгаворваліся на групах беднаты. Наперад не абмяркоўвалася пытаньне аб тым, колькі кожны кулак і заможнік **можа і павінен здаць лішкаў хлеба.** На сходах сельсаветчыкі прапанавалі ўсім сялянам—беднаце, серадняком і кулакам—здаваць колькі хто можа. Ніхто не падумаў аб тым, што **такі** мэтад выкананьня хлебазагатовак прынясе **немалую** карысьць кулаку, які захавае свае лішкі. У камісіі садзейнічаньня хлебазагатоўкам у радзе сельсаветаў пралезьлі кулакі, якія ўсюды праводзілі прынцыпы «ўраўнілаўкі».

Такія весткі атрыманы з большасьці раёнаў акругі. Яны гавораць аб тым, што кулак свае лішкі ня здаў, што ён схаваўся за сьпіной беднаты. Аб гэтым вельмі добра сьведчыць той факт, што з боку кулакоў няма скаргаў на непасільнае іх абкладаньне. Кулакі маўчаць, бо яны засталіся задаволены гэткім мэтадам хлебазагатовак. Здарылася гэта таму, **што сельсаветы не прытрымліваліся клясавай лініі і далі кулаком магчымасьць захаваць свае лішкі хлеба.**

У сучасны момант пачалася праверка правядзеньня хлебазагатовак. Гэта праверка павінна **выкрыць усе дапушчаныя на мясцох памылкі.** Беднота павінна зараз дапамагчы дзяржаве **ўзяць у кулака ўсе лішкі хлеба, якія яму ўдалося дагэтуль захаваць.**

М—кі.

Як кулак хацеў ашальмаваць чарвоны абоз

Кулак Ксяневіч з в. Сухадолы, Самахвалавіцкага раёну, здаўна вядомы, як заядлы вораг савецкай улады. Некалькі год таму назад ён прыцягваўся да адказнасьці за актыўны ўдзел у контр-рэвалюцыйнай арганізацыі, якая працавала на карысьць адцэй суседняй дзяржавы. Сваю нянавісьць да беднаты Ксяневіч выказваў і выказвае вельмі выразна, робячы ўсё для таго, каб паралізаваць яе ролю ў вёсцы.

Сваю варожую работу кулак Ксяневіч нядаўна папоўніў наступным манэўрам. Калі праз вёску Сухадолы праяжджаў чырвоны абоз з суседняй вёскі, Ксяневіч, карыстаючыся тым, што яго ня ведаюць, прымазаўся да абозу. Ускінуўшы на адзін з вазоў мяшок збожжа, Ксяневіч парашыў таксама скарыстаць для сябе гонар чырвоных абозьнікаў. Тактыка не пазбаўлена дасьціпнасьці.

Але, прымазаўшыся да чырвонага абозу, кулак Ксяневіч (ападаткаваны індывідуальна на 378 руб.), зразумела, не забыў сваёй зьвярынай злосьці да савецкай улады і беднаты, ён проста парашыў перахітрыць іх. І вось, калі чырвоны абоз прыехаў к месцу здачы, кулак Ксяневіч пацікаў здымае свой 5-пудовы мяшок збожжа і... высыпае літаральна сьмецьце і пясок, нароўчы насыпаць яго так, каб сапсаваць усё збожжа, якое там ужо было (а было там каля 155 пудоў жыта).

Гэты шкодніцкі ўчынак кулака Ксяневіча першымі заўважылі самі чырвоныя абозьнікі

Ксяневіч хацеў дабіцца дзьвёх мэтаў: 1) Ашальмаваць чырвоны абоз і абозьнікаў беднякоў і сераднякоў, што выконвалі свае абавязкі перад дзяржавай і 2) адначасна, высыпаючы сьмецьце ў засек, псаваць сабраны ўжо там хлеб.

Нічога дзіўнага няма ў тым вялізарным абурэньні, якое выклікаў гэты кулацкі ўчынак ва ўсіх чырвоных абозьнікаў. Яны тут-жа хацелі зрабіць самасуд над кулаком Ксяневічам, гаворачы: «Хай ня ганьбіць, сабака кулак, нашага чырвонага абозу».

Ксяневічу ўдалося выратавацца толькі ашуканствам, заявіўшы, што ён — бядняк і, быццам, прывёз засьмечанае збожжа «па беднасьці». Зараз кулак—контр-рэвалюцыянэр Ксяневіч прыцягнуты да судовай адказнасьці. Высьветлілася, што ён разам з іншымі кулакамі, высланымі за контр-рэвалюцыйную работу з БССР, **увесь час вядзе сыстэматычную агітацыю супроць палітычных і гаспадарчых мерапрыемстваў сельсавету і РВК.** Так Ксяневіч зрываў зямляўпарадкаваньне в. Сухадолы, пагражаючы тэрорам беднаце і каморніку, які праводзіў абрэзку кулацкіх гаспадарак.

Апошні ўчынак кулака Ксяневіча ёсьць акт роспачы з прычыны няўдачы яго агітацыі. Беднота і серадняцтва патрабуюць ад пралетарскага суду ізаляваць іх ад ворага і контр-рэвалюцыянэра Ксяневіча.

Сельнор.

Шкодніцкі загатавок

Чаму псуюцца бульба і збожжа

Ужо ня раз мы адзначалі ў «Зьвязьдзе», што мала сабрань сваячасова хлеб і бульбу, трэба гэты хлеб і бульбу яшчэ і захаваць і перасьцерагчы ад псаваньня. Мы ня будзем зноў спыняцца на тым, якое значэньне мае сваячасовая выгрузка і адгрузка хлеба і бульбы, сваячасовая падача вагонаў. Але атрыманыя намі сёньня карэспандэнцыі з акруг і раёнаў гавораць аб тым, што на мясцох некаторыя работнікі бюракратычна адносяцца да хаваньня хлеба і бульбы. Вось некалькі фактаў.

Сяляне вёсак Капусьціна і Лукі нядаўна арганізавалі чырвоны абоз з 120 фурманак і прывезьлі на станцыю Васілевічы звыш 2.300 пуд. бульбы. Напярэдадні старшыня спажывецкага таварыства папярэдзіў адміністрацыю чыгункі аб неабходнасьці падрыхтаваць вагоны. Але бюракраты з чыгункі не паклапаціліся аб гэтым. **У выніку сяляне прымушаны былі пакінуць бульбу пад дажджом.** Каля 3.000 пудоў бульбы ледзь не загінула.

Сяляне Вяляцішкага сельсавету, Барысаўскага раёну, адгукнуліся на заклік ураду і арганізавалі чырвоны абоз з бульбай, якую даставілі на станцыю Прыяміна. Чыгуначныя чынушы замест таго, каб падаць вагоны пад бульбу і вызваліць сялян, пачалі ў свабодныя вагоны грузіць дровы. Сяляне, якія прыехалі яшчэ досьвіткам, прымушаны былі бадзяцца да самага вечара, пакуль у іх прынялі бульбу.

30-га кастрычніка 10 сялянскіх фурманак прывезьлі ў **Барысаў 800 пуд. хлеба. Працаўнікі Барысаўскага ЦРК замест таго, каб прыняць хлеб у краму, пакінулі яго на дварэ. У выніку — палова хлеба змокла ад дажджу.**

2-га лістапада сяляне Горацкага раёну даставілі ў Горкі чырвоным абозам бульбу. Прыёмшчык Цофнас гэту бульбу прыняў, а па мяшкі прапанаваў «прыйсьці заўтра». Калі на другі дзень 25 сялян зьявіліся за мяшкамі, Цофнас ім зноў прапанаваў «прыйсьці заўтра». Так сяляне на працягу 5 дзён па 12 вёрст хадзілі па мяшкі. Толькі дзякуючы ўмяшаньню пракуратуры, мяшкі былі вернуты.

Б.

Пад суд за зрыў хлебазагатовак

СТАРШЫНЯ АЗАРЫЦКАГА РАЙВЫКАНКОМУ І ЗАГАДЧЫК ФІНЧАСТКАЙ ПАВОДЛЕ ПАСТАНОВЫ СУДУ ЗЬНЯТЫ З ПРАЦЫ

(Ад нашага мазырскага карэспандэнта)

Нядаўна мы ў «Зьвязьдзе» паведамлялі, што работнікі Азарыцкага райвыканкому адданы пад суд за зрыў хлебазагатовак. 6-га лістапада гэта справа разглядалася ў Мазырскім акруговым судзе. На судзе досыць яскрава выявілася, наколькі нашымізавыя працаўнікі часта даволі нясур'ёзна адносяцца да тых адказных задач, якія ставіць перад імі партыя і савецкая ўлада.

Працаўнікі Азарыцкага райвыканкому з першых дзён хлебазагатоўчай кампаніі не ўсьвядомілі сабе **яе сапраўднай клясавай сутнасьці.** У выніку ва многіх вёсках раёну праводзілася «ўраўнілаўка». Гэта выклікала нездавальненьне беднаты, якое было выкарыстана кулакамі для выступленьняў супроць хлебазагатовак. У дзьвох вёсках кулакі нават абвясьцілі байкот супроць задачы хлеба дзяржаве. Вось да чаго давялі прымірэнчыя адносіны да кулакоў з боку працаўнікоў райвыканкому.

Старшыня райвыканкому т. Бубліе у самы разгар хлебазагатовак разьяжджаў па вёсках у сувязі з чысткай савецкага апарату. **Але справай хлебазагатовак на мясцох ён зусім ня цікавіўся і ка ўжываў ніякіх мер да ўзмацненьня хлебазагатовак.** Хлебазагатоўкі ў раёне праводзіліся стыхійна, без усялякага пляну, **ня было ніякага ўліку здачы хлеба беднякамі і сераднякамі.** Райвыканком ня ўжываў ніякіх мер да сваячасовай падрыхтоўкі складзіх памяшканьняў.

Працаўнікі райвыканкому вельмі нядбайна адносіліся да сваіх абавязкаў. Калі райвыканкомам была атрымана дырэктыва СНК БССР аб узмацненьні хлебазагатовак і націску на кулака, **працаўнікі райвыканкому спакойным чынам падшылі гэту паперу да справы.**

Выяўленьне кулацкіх гаспадарак у раёне пастаўлена вельмі дрэнна. З пачатку былі выяўлены 32 такія гаспадаркі, а пасьля прыбавілася яшчэ 45. А калі добра пакапацца, то напэўна знойдуцца яшчэ такія гаспадаркі. У выніку такой работы вераснёўскае заданьне па хлебазагатоўках было сарвана.

Акруговы суд, які разглядаў гэту справу, **пастанавіў зьняць з работы старшыню райвыканкому Бубліса, а таксама загадчыка фінчасткай і забараніць ім займаць адказныя пасады на працягу аднаго году.** Загадчыку земельнай часткай вынесена грамадзкае ганьбаваньне.

М. В.

„Усё само сабой зробіцца"

ВОРША. (Наш кар.). Яшчэ 23-га верасьня на нарадзе старшынь с.-г. таварыстваў Аршанскай акругі было пастаўлена з усёй выразнасьцю пытаньне аб сваячасовым зборы закантрактаванага збожжа. Аднак, ня гледзячы на гэта, на сёнешні дзень мы маем вельмі сумны малюнак паступленьня закантрактаванага збожжа па Аршаншчыне. Кантрактантамі здана 88 проц. ільнанасеньня, 17 проц. аўсу і ячменю і 49 проц. бульбы. Ільна-валакно толькі яшчэ пачынае паступаць. Слаба паступае закантрактаванае збожжа і ад калгасаў. Асабліва дрэнна ідзе паступленьне закантрактаванага збожжа па Крупскім, Цялерынскім, Смалянскім, Доўгавіцкім крэдытных т-вах, якія яшчэ не пачалі зьбіраць збожжа. Старшыням т-ваў абвешчаны суровыя вымовы з папярэджаньнем.

Прычынай слабога выкананьня пляну збору закантрактаванага збожжа зьяўляецца тое, **што крэдытныя т-вы, сельсаветы і райвыканкомы да гэтага часу не зьвяртаілі ніякае ўвагі на гэту справу.** Так, ужо ўвайшло ў звычку, што ўсё само сабой зробіцца, бо так павінна быць. А аб тым, што трэба селяніну напамінаць аб тэрмінах здачы збожжа, ніхто не падумаў.

Пытаньні, якія патрабуюць неадкладнага вырашэньня

Што паказала абсьледваньне Клімавіцкага раёну

Магілеўскім АК КП(б)Б была вылучана спэцыяльная камісія для вывучэньня сучаснага эканамічнага становішча Клімавіцкага раёну. Камісія правяла вялікую абсьледваўчую работу.

Не чакаючы вывадаў камісіі, мне хочацца спыніцца на радзе пытаньняў, якія патрабуюць неадкладнага вырашэньня.

Пытаньне аб масавай калектывізацыі ў нашых беларускіх умовах выключна складанае. Калі на тэрыторыі Паўночнага Каўказу, або іншых падобных яму раёнаў арганізуюцца так званыя калгасы «гіганты» на некалькі тысяч гэктараў, у нас гэта трэба лічыць вялікім дасягненьнем.

Наша беларуская сялянская гаспадарка мае рад спэцыфічных асаблівасьцяй: прызьмерна малую зямлязабясьпечанасьць, адсутнасьць вялікіх суцэльных масываў пахаці, адсутнасьць неабходнай спэцыялізацыі гаспадаркі, вялікая плошча неасвоеных зямель, грунтавыя ўмовы, адсталы спосаб апрацоўкі зямлі і г. д. Усё гэта бязумоўна, пры масавай калектывізацыі стварае цяжкасьці. Апрача таго, самае, па мойму, асноўнае—гэта вялікая розьніца ў формах калгасу, у параўнаньні з Паўночным Каўказам і Уралам. Там мы маем больш простыя формы калгасаў: так званыя табарыствы па сумеснай апрацоўцы, а ў нас такая простая форма сустракаецца вельмі рэдка. Сучасны калгас у БССР мае больш вышэйшыя формы, чым таварыствы па сумеснай апрацоўцы. А ў раёне масавай калектывізацыі аб самых простых формах калгасу і гаварыць ня прыходзіцца.

Ужо калектывізавана больш за 50 проц. пахаці. Такім чынам, тэмп калектывізацыі перавышае ўсякія мерканьні.

Хваля калектывізацыі ахапляе ўсё новыя і новыя тэрыторыі. Злачынна было-б стрымліваць гэту хвалю, але мясцовыя работнікі ўжо аб гэтым пачынаюць гаварыць. Адкуль бярэцца такія настрої? Мясцовыя работнікі захватваюцца гэтай хваляй, вярней, не пасьпяваюць нават арганізацыйна афармляць новыя калгасы. А хіба-ж толькі ў афармленьні справа? Трэба ўсямерна ўзмацняць гэтыя калгасы, а для гэтага патрэбны каморнікі, аграномы, кіраўнікі.

Побач з гэтым трэба вырашыць пытаньне аб размерах калгасаў. Пакуль што яшчэ нічога пэўнага на гэтым пытаньні няма, ідуць тэарытычныя спрэчкі. Работнікі месц пакуль што прытрымліваюцца прынцыпу «колькі можна, толькі і аб'яднаем». Патрэбны цьвёрдыя дырэктывы, а то гэтае «колькі» можа стварыць вялікія цяжкасьці.

Пытаньні статутнага парадку таксама патрабуюць неадкладнага вырашэньня. **На жаль, сучасны тыповы статут калгасу не адпавядае жыцьцёвым патрэбам і поўнасьцю не забясьпечвае правядзеньня клясавай лініі, асабліва ў раёнах масавай калектывізацыі.**

Напрыклад, арганізававаму калгасу трэба забясьпечыць сябе на вясну насенным фондам. Прымаецца пастанова: сабраць №-ю колькасьць насеньня па некалькі пудоў з паю... І вось здараецца, што бядняк мае пяць паёў, а серадняцкая гаспадарка і заможная—часамі па два паі. Забясьпечанасьць-жа насенным фондам гэтых гаспадарак да ўступленьня ў калгас зусім нароўная. І вось бядняк павінен даць столькі-ж...

Увядзеньне дыфэрэнцыяванага паю ў калгасах таксама патрабуе неадкладнага вырашэньня. Гэта сыстэма будзе дапамагаць максымальнаму скарыстаньню сродкаў насельніцтва і да некаторай ступені нівеляваць тую няроўнасьць, якую мы вымушаны канстатаваць сёньня. У радзе калгасаў уклады звыш паю складаюць значную велічыню і калгас плаціць вялікія процанты. Апрача таго, заможныя і серадняцкія гаспадаркі пры ўступленьні ў калгас часамі імкнуцца рэалізаваць лішнюю гаспадарку ці маемасьць, якую трэба будзе ўлажыць звыш паю, як уклад у калгас. Такім чынам, праблема максымальнага выкарыстаньня сродкаў насельніцтва яшчэ ня вырашана.

Увядзеньне дыфэрэнцыяванага паю нямінуча падыме пытаньне аб адлічэньнях у непадзельны капітал калгасу. Да гэтага часу гэтыя адлічэньні былі вельмі нязначныя. Калі гэта можна было цярпець пры ўмеркаваным тэмпе калектывізацыі, то зараз гэты факт нельга абыйсьці моўчкі. Тыповы статут калгасу трэба пераапрацаваць грунтоўна, пры стасаваўшы яго да раёнаў масавай калектывізацыі, з улікам тэмпу калгаснага руху.

І апошняе, на чым трэба спыніцца—гэта пытаньне аб кулаках. **Кулак быў і застанецца нашым клясавым ворагам,** аб урастаньні кулака ў калектыў і гаварыць ня прыходзіцца, ён непатрэбен калектыву і калектыў яго не жадае. Калектывістыя адкрыта заяўляюць: «нам кулакоў не патрэбна, мы бяз іх патрапім пабудаваць калгас і наогул весьці сацыялістычную гаспадарку і г. д.». Да гэтых заяў трэба чула прыслу-

Бліскучыя досьледы з жытня-пшанічным гібрыдам

Шырэй выкарыстаць вынікі досьледаў

Гібрыд павінен заняць ганаровае месца на палёх калгасаў і саўгасаў

Некалькі месяцаў таму назад мы пісалі аб досьледах па вырошчваньні жытня-пшанічнага гібрыду (помесі жыта і пшаніцы), якія праводзіліся беларускай станцыяй прыкладной батанікі. Сёлета гэта новая расьліна была

Пастанова парытэтнай камісіі па справе праф. Кісьлякова

Пры беларускай с.-г. акадэміі па справе праф. Кісьлякова была створана парытэтная камісія ў складзе прадстаўнікоў ад сэкцыі навуковых працаўнікоў праф. Папова і дацэнта Айзэнбэрга, прадстаўніка ад адміністрацыі акадэміі т. Пінчука і прадстаўніка НКА тав. Лысова.

На пасяджэньнях камісіі заслуханы паведамленьні праф. Кісьлякова аб яго навукова-пэдагагічнай і грамадзкай рабоце ў акадэміі, а таксама паведамленьні аб працы праф. Кісьлякова ад прадстаўнікоў студэнцтва і навуковых працаўнікоў і рэцэнзіі дацэнтаў Айзэнбэрга, Плятнэра і праф. Пінчука аб навуковых творах праф. Кісьлякова.

Парытэтная камісія на падставе ўсіх гэтых матар'ялаў вынесла рэзалюцыю, у якой зазначаецца, што перад Беларускай дзяржаўнай с.-г. акадэміяй у сучасны момант стаяць адказныя задачы падрыхтоўкі такіх кадраў спецыялістых, якія-б цалкам і поўнасьцю адпавядалі патрэбам сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

А. Кісьлякоў,—гаворыцца далей у рэзалюцыі,—сваёй папярэдняй дзейнасьцю навуковага і грамадзкага працаўніка выявіў сябе ў якасьці праваднра варожых ідэй і такіх палітычных настрояў, якія фармаваліся нацыянал-дэмакратычнымі элемэнтамі, што праводзяць кулацкую лінію ў БССР.

Кісьлякоў да апошняга часу ня даў канкрэтных практычных довадаў свайго пераходу на правільны навуковы і палітычны шлях. Камісія прызнае, што І. А. Кісьлякоў па ступені сваёй маркасцкай і навуковай падрыхтоўкі не адпавядае годнасьці прафэсара і лічыць немагчымым заставаньне прафэсара Кісьлякова на рабоце ў акадэміі.

На падставе параграфа 15 п. «б» палажэньня аб навуковых працаўніках прызнана немажлівым захаваньне за І. А. Кісьляковым годнасьці прафэсара.

Прымаючы пад увагу прызнаньне Кісьлякова у парытэтнай камісіі дапушчаных ім мэтадалёгічных і палітычных памылак, выяўленьне Кісьлякова у катэгарычнай форме імкненьня дабіцца аўладаньня марксыцкімі мэтадамі і гатоўнасьць Кісьлякова актыўна працаваць па ажыцьцяўленьні сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі парытэтная камісія парашала паставіць перад адпаведнымі органамі пытаньне аб далейшым скарыстаньні Кісьлякова, каб ён змог ва ўмовах належнага кантролю на справе выправіць свае памылкі.

НКФ і НКЮ абаранялі буйнога гандляра

ПАСТАНОВА ПРЭЗЫДЫУМУ ЦКК ПА СПРАВЕ ЛАПІРАВА

Прыблізна два тыдні назад на «Стороны РСІ» газэты «Зьвязда» быў зьмешчаны артыкул аб тым, што Наркамфін БССР і Наркамюст сталі на абарону буйнога гандляра, злоснага неплацельшчыка падаткаў, **Лапірава.**

Гомельская акруговая падатковая камісія абклала Лапірава ўраўнальным і прыбытковым падаткам у суме 17.000 руб.

Гр. Лапіраў абскардзіў пастанову ў НКФ. Наркамфін на падставе заявы Лапірава скасаваў правільную пастанову Гомельскай камісіі і паслаў у Гомельскі акрфа адносіну, якая ставіла пытаньне аб неабходнасьці зьмяншэньня падатку. Наркамфін на працягу 59 дзён затрымліваў пастанову на справе, кіраўнікі НКФ не адважваліся зацьвердзіць вызначаны Лапіраву падатак. НКФ не прыцягнуў да крымінальнай адказнасьці Лапірава, як злоснага неплацельшчыка **падаткаў.**

Наркамюст БССР два разы незаконна спыняў таргі на продаж дому Лапірава за злосную нявыплату падаткаў. Наркамюст незаконна прыпыніў судовую справу аб высяленьні Лапірава пасьля таго, як яго дом быў куплены фармкіраўніцтвам.

Ён нават настойваў, на аснове неправераных заяў гр-кі Лапіравай, на прыцягненьні да крымінальнай адказнасьці прадстаўнікоў Гомельскага акрфа, нібы вінаватых у продажы дому Лапірава ніжэй ацэнкі.

Гэтую справу разглядаў прэзыдыум ЦКК КП(б)Б. Прэзыдыум прызнаў, што **справа гэта зьяўляецца яскравым прыкладам скрыўленьня клясавай лініі кіраўнікамі НКФ і НКЮ, што ў гэтых кіраўнікоў усім прытупілася клясавае пачуцьцё, што яны мэханічна штампавалі працу свайго апарату.**

Прэзыдыум ЦКК пастанавіў абвясьціць **суровую вымову** з папярэджаньнем былому памочніку пракурора рэспублікі тав. **Гохману,** які раней быў зьняты пастановай ЦКК з работы ў НКЮ з забаронай на працягу 3-х год займаць адказныя пасады.

Абвешчана **вымова** памочніку пракурора рэспублікі тав. **Нараенка,** які у якасьці сакратара парт'ячэйкі, падпісаў сумесна з Гохманам тлумачэньне ЦКК, у якім цалкам з ім салідарызаваўся (пасьля ён часткова прызнаў сваю памылку).

Матар'ял у адносінах пракурора **Баніна,** як беспартыйнага, накіраваць у камісію па чыстцы апарату НКЮ, лічачы немагчымым пакінуць яго надалей на адказнай рабоце ў судовых органах.

Абвешчана суровая вымова нам. наркамфіну т. Буніну і начальніку падатковага кіраўніцтва НКФ т. Кардашэнка за праяўленую ў справе Лапірава клясавую нявытрыманасьць.

Прэзыдыум ЦКК адначыў памылковасьць пазыцыі парт'ячэек НКЮ і НКФ у гэтай справе і прапанаваў ім абгаварыць пастанову ЦКК на агульных адкрытых сходах ячэек.

Як працоўная сэсія змазала клясавую лінію

Скончыўся разгляд справы кіеўскіх грабароў, якія абвінавачваліся ў злоснай эксплёатацыі батракоў па пабудове Дому Ураду ў Менску.

Акалічнасьці гэтае справы ў наступным:

У пачатку верасьня Белдзяржбуд запрасіў на земляныя работы арцель кіеўскіх грабароў, на чале якое знаходзіўся кулак эксплёататар **Зайцаў.** Гэта фіктыўная арцель мела 50 коняй, а для работы на пабудове яна наняла 12 батракоў з Полацкай і Магілёўскай акруг. З гэтымі рабочымі ніякага калектыўнага дагавору заключана ня было. Батракі працавалі пад выглядам членаў арцелі і моцна эксплёатаваліся, яны працавалі па 13 гадзін у суткі, спэцвопраткі ніякай не атрымлівалі, у страхкасе ня былі застрахаваны. Кожны з іх за сваю работу атрымліваў у месяц 30-40 руб. у той час, калі самі эксплёататары клалі ў свае кішэні па 15-17 руб. у дзень. Ільгота тут абыйсьці моўчкі і адносін Менскае акруговае страхкасы да гэтага выпадку. Калі адзін з членаў саюзу, што працаваў у гэтай фіктыўнай арцелі, захварэў, то Менская акрстрахкаса замест таго, каб выявіць, дзе ён працуе і чаму член саюзу не застрахаваны, абмежавалася толькі тым, што заявіла: «вы таварыш, у нас не застрахаваны і таму дапамогі па хваробе ў нас не атрымаеце».

Ведаючы, што цёмных і несьвядомых людзей лягчэй эксплёатаваць, Зайцаў і яго кампанія забаранялі батраком хадзіць на сходы і ў кіно, награжаючы звальненьнем за гэта. Зайцаў звычайна заяўляў, калі вас пакліча рабочком, або будзь распытваць пра работу, вы заявіце, што вы не батракі, а члены арцелі і працуеце на сваіх конях.

Урэшце ўсе гэтыя махінацыі былі выяўлены і Зайцаў са сваёй кампаніяй былі прыцягнуты да адказнасьці.

Перад судом—група злосных эксплёататараў у ліку 7 чал., сярод якіх галавары арцелі—Зайцаў і Прыходзька.

Ня гледзячы на тое, што гэты працэс павінен мець палітычнае значэньне і эксплёататары павінны былі атрымаць належнае пакараньне за злосную эксплёатацыю батракоў, палітычная, клясавая ўстаноўка працесу была змазана.

Працоўная сэсія, якая разглядала гэту справу ў паказальным парадку, падыйшла да гэтых эксплёататараў вельмі мякка. Інтарэсы батракоў поўнасьцю ня былі ўлічаны. Характэрна пры гэтым адзначыць, што саюз будаўнікоў, які павінен быў абслугоўваць батракоў на будаўнічых работах і абараняць іх інтарэсы, ня вызначыў нават спэцыяльнага прадстаўніка для прад'яўленьня на судзе да падсудных грамадзкага іску батракоў за звышнормавую работу. Незразумелы былі і паводзіны памп.ракурора т. **Сільнікава,** які замест рашучага выступленьня на судзе супроць гэтых эксплёататараў, тлумачыў усю гэту справу нашай някультурнасьцю. Суд абмежаваўся тым, што пастанавіў аштрафаваць Зайцава, Прыходзьку і інш. за злосную эксплёатацыю батракоў.

Гр.

МЕНСК

Два карпусы унівэрсытэцкага гарадка гатовы для заняткаў

Галоўны архітэктар Унівэрсытэцкага гарадка ў Менску тав. **Лаўроў,** у гутарцы з нашым супрацоўнікам паведаміў:

— Гэтымі днямі БДУ зданы першыя два карпусы Унівэрсытэцкага гарадка—мэдычны і анатамічны. У бліжэйшы-ж час навучальныя заняткі пераносяцца ў новыя будынкі. Усё патрэбнае абсталяваньне ёсьць. Мэдычны корпус складаецца з 5-ці аўдыторый на 100-150 чалавек кожная і раду розных лябараторый. Анатамічны корпус мае 2 вялікія аўдыторыі з амфітэатрамі і 2 анатамічныя музэі.

Сэкцыйная заля анатамічнага корпусу па сваіх разьмерах зьяўляецца буйнейшай у СССР. У сэкцыйнай залі можа займацца адначасова каля 200 студэнтаў на 40 апэрацыйных сталох.

Трэці — прыродазнаўчы корпус мяркуецца здаць 20-га лістапада, а чацьверты — хэмічны — да 1-га сьнежня.

Такім чынам, да 1-га сьнежня БДУ атрымае 4 новых карпусы Унівэрсытэцкага гарадка.

Новыя беларускія навуковыя інстытуты

Пры Беларускай Акадэміі Навук арганізуюцца новыя навуковыя інстытуты — гістарычных навук і мовазнаўства. Інстытут гістарычных навук будзе складацца з камісій па гісторыі Беларусі, сусьветнай гісторыі, у сувязі з гісторыяй Беларусі, археографічнай, археолёгічнай і гісторыі беларускага мастацтва.

Інстытут мовазнаўства аб'яднае ўсе ўстановы аддзелу гуманітарных навук, якія займаюцца вывучэньнем беларускай мовы, уключаючы і інстытут навуковай мовы. Дырэкцыя інстытуту мовазнаўства вылучана ў складзе акадэмікаў **Некрашэвіча і Лёсіка** і вучонага сакратара праф. **Бузука.**

Для аўтатранспарту будуць падрыхтаваны 450 шофэраў

У 1929-30 годзе БССР атрымае звыш 400 лёгкавых і грузавых машын. Але для абслугоўваньня гэтых машын няма патрэбных кадраў працаўнікоў.

Прэзыдыум Дзяржпляну пастанавіў на працягу 1929-30 году падрыхтаваць ня менш 450 шофэраў. Курсы пры Менскай аб'яднанай прафтэхшколе на працягу году дадуць 90 шофэраў. Па падрыхтоўкі астатніх 360 ч. Наркампрацы даручана арганізаваць у Менску курсы з беспрацоўных на 180 чалавек. Тэрмін навучаньня—6 месяцаў. Апрача таго, арганізуюцца курсы шофэраў на 180 чалавек пры Віцебскім папітэхнікуме. На гэту мэту адпускаецца 53.000 руб. Курсы будуць камплектавацца галоўным чынам з беспрацоўных, па камандыроўках Камзэту і г. д.

Чаму МЦРК ня выканаў заказаў на гародніну

На сёнешні дзень у МЦРК паступіла звыш 1.000 папярэдніх заказаў на гародніну з дастаўкай на дом. Да апошняга часу выканана каля 400 заказаў. Прычыны такога неакуратнага выкананьня наступныя: у сувязі з тым, што ў Менск да кастрычнікавых сьвят прыбывала шмат чырвоных абозаў, а таксама грузаў на чыгунку увесь транспарт МЦРК быў мабілізаваны на работу па прыёмцы збожжа і выгрузцы тавараў.

Таксама шмат часу займала адборка бульбы (пайшчыкам дастаўляецца адборная бульба).

Зараз узьнты ўсе захады для выкананьня заказаў пайшчыкаў на гародніну. Тыя пайшчыкі, якія заказалі гародніну да 7-га лістапада, атрымаюць яе не пазьней 15-га лістапада.

Заказаўшыя гародніну з 10-га лістапада атрымаюць праз 7—8 дзён.

За дзень

Трактарная калёна БССР. Па ініцыятыве рабочых саўгасаў і батракоў сабрана каля 1.000 руб. на арганізацыю трактарнай калёны БССР.

Таварыства аграрнікаў-марксыстых. Пры Беларускай с.-г. акадэміі арганізаваліся 2 новыя навуковыя т-вы — аграрнікаў-марксыстых і ваяўнічых матар'ялістых.

Новыя студэнцкія сталоўкі. У Віцебску, Магілеве і Гомелі адкрыліся новыя студэнцкія сталоўкі. Адкрыцьцё сталовак аслабаняе студэнцкія арганізацыі ад значнай часткі гаспадарчай работы.

У Доме Пісьменьніка

⊙ Агульны сход пісьменьнікаў гор. Менску вызваліў тав. **Коласа** ад абавязкаў старшыні праўленьня Дому Пісьменьнікаў у сувязі з перагружанасьцю яго іншай працай. Гэта пасада часова ўскладзена на тав. **Крапіву.**

⊙ Складзена спецыяльная камісія па абароне аўтарскага права (выконваньне выдавецтвам дагавораў, своячасовы адказ на рукапісы, ганарарны закон). У камісію ўвайшлі пісьменьнікі **А. Звонак, К. Чорны, і В. Сташэўскі.**

Комсамольская вячорка па радыё, прысьвечаная 10-годзьдзю КІМ'у

«Чырвоная зьмена па радыё» сумесна з Домам Камсамолу арганізоўвае сёньня па радыё на хвалі 700 мэтраў вялікую інтэрнацыянальную вячорку, прысьвечаную 10-годзьдзю КІМ'у.

У зьмест вячоркі ўваходзіць: як арганізавать вячорку ў ячэйцы (мэтадычныя паказаньні), масавыя інтэрнацыянальныя гульні, баявыя інтэрнацыянальныя сьпевы, вершы, апавяданьні і г. д.

Пачатак вячоркі роўна а 8 гадзіне 30 мінут.

Усе камсамольцы, уся рабочая моладзь павінна слухаць інтэрнацыянальную вячорку, рыхтавацца да сьвяткаваньня юбілею КІМ'у ў сваёй ячэйцы.

Рабселькоры пішуць

БОЛЬШ РАЦЫЯНАЛЬНА СКАРЫСТАЦЬ ВАПНЯНЫЯ МЛЫНЫ

У некалькіх пунктах Старадароскага раёну Белсельсаюз у гэтым годзе пабудаваў некалькі млыноў для перамолу вапняных каменьняў. Вапнаваньне глебы—справа добрая, а таму наогул пабудову такіх млыноў прыходзіцца толькі вітаць. Бяда толькі вось у тым, што Белсельсаюз зусім паказённаму аднёсься да пабудовы гэтых млыноў. А ў выніку—некалькі млыноў пабудаваны ў такіх пунктах, дзе зусім няма сырцу. З тымі-ж млынамі, дзе ёсьць сырэц і млыны нагружаны, здараецца другая бяда. Іменна тое, што млыны не забясьпечаны запаснымі часткамі (каласьнікі і інш.). Пры 8-гадзінным рабочым дні і пры нармальнай нагрузцы каласьнікоў хапае толькі на 15 дзён, пасьля чаго яны прыходзяць у поўную нягоднасьць. А з-за адсутнасьці гэтых каласьнікоў млыну прыходзіцца стаяць. Ёсьць і яшчэ дэфэкты ў канструкцыі саміх млынкоў: у іх рамы пастаўлены вельмі крыва, а гэта адбіваецца на рабоце. Малаткі зроблены так, што яны ў сярэдзіне пустыя. Ад гэтага бываюць частыя паломкі малаткоў, што пагражае выбухам.

Белсельсаюзу трэба аб гэтым падумаць. Трэба будаваць млыны там, дзе ёсьць сырэц, і забясьпечыць іх запаснымі часткамі. А заводу «Энэргія» трэба канструкцыю машын удасканаліць.

МАЛАКОВІЧ.

ДЗЕ ДЗЕЛІСЯ СЬВІНЬНІ

Аршанскае аддзяленьне Дзяржгандальбелу нагрузіла вагон сьвіней для адпраўкі ў Ленінград. Але праваднік вагону нейкім чынам згубіў вагон з сьвіньнямі. Нумару вагону ён ня ведаў. Шукаў, шукаў, а вагону няма. Тады, ён, думаючы, што сьвіньні паехалі ў Ленінград самі, кур'ерам пакаціў у Ленінград. Але і там сьвіней не знайшоў.

Цікава ведаць, дзе-ж гэта яны могуць блытацца. Папершае, яны-ж ня іголка, што іх так лёгка было згубіць, а падругое, без яды і вады яны могуць перадохнуць.

Дзяржгандальбел, тэрмінова знайдзі сваіх сьвіней.

ВЕДАЮЧЫ.

Каго абараняе Давідоўскі

За сыстэматычнае п'янства і злоўжываньні на працы Менакрсуд прысудзіў лясьніка Дразда да 6 месяцаў пазбаўленьня волі. Пасьля гэтага на месца Дразда быў прыняты бядняк Крывіцкі. Ня гледзячы на тое, што Крывіцкі прапрацаваў на пасадзе лясьніка больш за 6 месяцаў, старшыня рабочкому Сьмілавіцкага лясьніцтва Давідоўскі ня толькі не правёў яго ў саюз, а нават пастараўся яго звольніць, дапамагчы пры гэтым Дразду зноў залічыцца на пасаду лясьніка.

Вось як Давідоўскі абаранле п'яніц і выганяе вон беднякоў.

В.

Сотні тысяч кв. мэтраў жылой плошчы--ў руках прыватніка

Прыватныя камяніцы перадаць ЖАКТ'ам

Зусім нядаўна газэта «Зьвязда» ўзьняла пытаньне аб муніцыпалізацыі камяніц, якія знаходзяцца ў руках прыватніка. Па адным Менску ў руках прыватніка знаходзіцца каля 400 вялікіх камяніц. Газэта адзначала, што домаўласьнікі зусім ня цікавяцца становішчам дамоў і імкнуцца толькі да максымальнага выцісканьня прыбыткаў. Абавязковыя пастановы гарсавету аб утрыманьні дамоў, аб капітальным рамонце ня выконваюцца.

Газэта «Віцебскі Пралетары» ў адным з апошніх нумароў падтрымала прапанову газэты «Зьвязда». У вялікім артыкуле **«5 мільёнаў адданы клясаваму ворагу»** газэта падае дад прыкладаў парушэньня домаўласьнікамі абавязковых пастаноў гарсавету.

На прыблізным падліку, у адным Віцебску незаконна пакінута ў руках прыватніка дамоў з плошчай 64 тысячы кв. мэтраў, коштам каля 5 мільёнаў рублёў. У залежнасьці ад прыватніка знаходзіцца больш за 10 тысяч працоўных.

Домаўласьнікі падтрымліваюць у парадку толькі тыя кватэры, дзе жывуць кватаранты, якія плацяць па згодзе, а кватэры рабочых зусім не рамантуюцца, а сьвядома руйнуюцца, каб пазбавіцца ад нежаданага кватаранта.

Газэта «Віцебскі Пралетары» лічыць, што рабочая кляса павінна праявіць свае правы на жыльлёвы фонд, які знаходзіцца ў руках клясавага ворага, што дырэктывы партыі адносна прыватна-капіталістычнага сэктару ў гарадох, якія раней былі парушаны, павінны зараз быць выкананы.

Прапанова віцебскай газэты зусім правільная.

У мэтах зьмяншэньня жыльлёвага крызісу, у мэтах абароны працоўных мас гораду трэба адабрацьь буйныя дамы ад прыватнікаў.

Пакуль што ў гэтай галіне нічога ня зроблена. У газэтах прамільгнула заметка аб тым, што Менскі камгас зьбіраецца муніцыпалізаваць прыватныя камяніцы. На гэтым справа скончылася. За безгаспадарчасьць муніцыпалізавана толькі 13 камяніц. Справа ў тым, што закон, які дазваляе адбіраць дамы за безгаспадарчасьць, абстаўлены такімі фармальнасьцямі, што домаўласьнікі маюць магчымасьць доўгі час трымацца за сваю маемасьць.

Мы прапануем галоўнаму кіраўніцтву камунальнай гаспадаркі неадкладна заняцца муніцыпалізацыяй прыватных дамоў, ударыць па рэштках капіталістычнага сэктару ў гарадох.

Буйныя дамы, якія знаходзяцца ў руках прыватніка, павінны быць перададзены ЖАКТ'ам і камгасам.

Прыватнікі спэкулююць дамамі

Зьдзелкі з домаўласьнікамі ня будуць прызнаны

У судовых органах Менску зараз разглядаецца рад спраў аб муніцыпалізацыі прыватных дамоў. Каля 20 дамоў ужо муніцыпалізаваны і перададзены Жактам.

У зьвязку з гэтым домаўласьнікі ў сьпешным парадку заключаюць зьдзелкі на продаж часткі домаўладаньняў, бяруць кватэрную плату за год уперад і г. д. Усё гэта робіцца для таго, каб ашуканскім спосабам атрымаць будучыя прыбыткі ад дамоў, якія павінны быць муніцыпалізаваны.

У Гарсавеце нашаму супрацоўніку заявілі, што ўсе зьдзелкі, якія заключаюцца з уласьнікамі дамоў, якія падлягаюць муніцыпалізацыі, ня будуць прызнаны.

Суд

„Слоня" не заўважылі

Уласьнікі фабрыкі „Слонь" утаілі ад абкладаньня 64 тыс. руб. прыбытку

11 лістапада Менскі акруговы суд пачаў слухаць справу ўласьнікаў фабрыкі мэталёвых вырабаў у Койданаве «Слонь». Акалічнасьці гэтае справы наступныя:

Калі праводзілася абсьледваньне, як падаткоўваліся ўласьнікі фабрыкі «Слонь», то было выяўлена, што прыбыткі іх улічаны ня цалкам.

Старшыня вучастковай камісіі па абкладаньні т. **Сэгаль,** абкладаючы фабрыку за час яе існаваньня па 1 кастрычніка 1925 году, абмежаваўся паданымі справакамі ўласьнікаў аб іх прыбытку, фактычна не праверыўшы гэтых дакумантаў.

Інспэктар Менакрфа **Барышанскі,** правяраючы, выявіў, што прыбытак фабрыкі «Слонь» куды больш, чым паказана было ў дакумантах, а іменна—16.818 рублёў. Выходячы з гэтых прыбыткаў, фабрыка «Слонь» і была абкладзена падаткам.

НКФ, правяраючы рахункаводзтва фабрыкі, ўстанавіў, што фактычна прыбытак уласьнікаў яе да 1-га лістапада 1925 г. складаў 19.000 рублёў. Але і гэта сума была няправільнай, было ўстаноўлена, што прыбытак фабрыкі «Слонь» фактычна яшчэ больш.

За 1925-26 год уласьнікі фабрыкі паказалі свае прыбыткі на 27.000 руб. менш фактычных.

У лістападзе 1928 г. уласьнікі фабрыкі «Слонь» паказалі звыш 4.000 рублёў страт, між тым, спецыяльнае абсьледваньне акрфа ўстанавіла прыбытак 13.000 руб. Акрамя яўных фіктыўных вестак, уласьнікі парушылі ўсе правілы і законы аб справаздачнасьці. балансы своячасова не прадстаўляліся, наогул уся сыстэма рахункаводзтва па гэтай фабрыцы спрыяла зьмяншэньню прыбытку.

Прыцягнуты да адказнасьці бухгальтар **Зарын** паказаў, што так весьці бухгальтэрыю яго прымусілі гаспадары фабрыкі. Праведзеная экспэртыза ўстанавіла, што, дзякуючы няправільным спраўкам і балянсам, гаспадары фабрыкі «Слонь» утаілі ад абкладаньня 64.000 руб., прычым на 1-га кастрычніка 1929 г. засталося запазычанасьці каля 19.000 руб., акрамя пені.

Да адказнасьці па гэтай справе прыцягнуты ўласьнікі фабрыкі «Слонь» **Е. і М. Сьліозбэргі,** Ліўшыц, Вігдорчык, Рубенчык, Нясьвіскі і бухгальтар Зарын па 92 арт. К. К. п. «б» (утойваньне па ўзаемнай згодзе аб'ектаў аладаткаваньня і няправільнае вядзеньне рахункаводзтва) і інспэктары акрфа Сэгаль, Барышанскі і Перагуд па 196 арт. К. К. (нядбайнасьць)

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

У сераду, 13-га лістапада а 4-й гадзіне дня на заў. «Бальшавік» адбудзецца пасяджаньне Прэзыдыму Бел. МБІТ

З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ:

Інфармацыя ячэек ІТР заводаў «Бальшавік», «Чырвоная Зорка», «Энэргія» аб эканом. рабоце, у асаблівасьці аб удзеле ІТР у сан. спаборніцтве.

Запрашаюцца члены Прэзыдыму БМБІТ і члены Бюро ІТС.

Сёньня, 12-га лістапада, а 7 гадзіне ўвечары ўпамяшк. АК МОПР'у скліканца нарада **ўдарнай брыгады для паездкі ў Барысаў,** на якую павінны зьявіцца наступныя т. т.: **Канстанцінаў, Янушкевіч, Юшкевіч, Бэрлацкі, Протас, Хмялеўскі. Файнштэйн, Гарнаеы, Кагэн, Робінраўт, Гітліц, Кацман, Партная, Шышко, Любімская Протас.**

Мен. АК МОПР'у.

— **Клюб навуковых працаўнікоў.** Сёньня, а 9-й гадзіне ўвечары чарговы заняткі маркысцка-ленінскага гуртку. Запіс жадаючых працятваецца.

— **Дом Камасьветы імя Карла Маркса.** Сёньня кіно «Джымі Хігінс». Пачатак першага сэансу а 8-й гадзіне, другога—а 10-й гадзіне ўвечары.

— **Дом Асьветы.** 13-га лістапада, а 8-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні Дому Асьветы склікаецца агульны сход асьветнікаў-яўрэяў з наступным абвесткай дня: «Вынікі антырэлігійнай кампаніі».

— 12-га лістапада, а 3-й гадзіне дня ў памяшканьні ЦП саюзу Працасьветы склікаецца нарада сакратароў групкомаў, мясцкомаў саюзу Працасьветы г. Менску. Яўка абавязкова.

— 13-га лістапада, а 10-й гадзіне раніцы выклікаюцца да намесьніка рэктара БДУ наступныя асьпіранты: Дзянісюк, Каган, Майзэль Ю., Мазэль Я., Скардзіс, Шапавалаў, Якубчык, Расін, Мароз, Рудзіцкі і Зайчык. А 12-й гадзіне дня павінны зьявіцца наступныя таварышы: Некрашэвіч, Сускі, Андрэеў, Багач, Бандаровіч і Бірыч.

— Вячэрні камвуз апавяшчае ўсіх студэнтаў, якія займаюцца ў камвузе, што заняткі на ўсіх курсах адбудуцца ў наступныя чысла: 3, 4, 5, 8, 9, 13, 14, 15, 17, 18, 19, 23, 24, 25, 28, 29.

БДУ. 12-га лістапада, а 7-й гадзіне ўвечары ў 41-й аўдыторыі адбудзецца закрыты сход партактыву ячэйкі КП(б)Б Пэдфаку, сумесна з камісіяй па чыстцы ячэйкі, на які павінны зьявіцца ўсе курсоргі, партыйцы дэканату, прафкому, партыйцы, якія працуюць у іншых грамадзкіх арганізацыях, і ўсе жадаючыя партыйцы.

Адзіная партыйная школа паведамляе, што заняткі ў школе будуць праводзіцца ў наступныя чыслы кожнага месяца: 3, 5, 8, 13, 15, 18, 23, 25, 28.

Наступныя заняткі адбудуцца 13-га лістапада, а 7 гадз. увечары.

Яўка ўсіх слухачоў абавязкова.

20-га лістапада склікаюцца месячныя курсы сакратароў саўгаскіх і калгаскіх ячэек КП(б)Б у г. Барысаве. Усім райкомам КП(б)Б трэба своячасова абвясьціць і камандыраваць вылучаных камуністых на гэтыя курсы паводле раней даных указаньняў. Прыбываючым таварышом на курсы зварачацца ў АПА Барысаўскага райкому КП(б)Б.

ПАПРАЎКА.

Ва ўчарайшым нумары «Зьвязды» па недагледзе аўтара ў артыкуле «Рэзалюцыі і сапраўднасьць» дапушчана прыкрая памылка.

Напісана, што т. **Гарнашэвіч,** член ячэйкі Менакрэа, выключаны з партыі. Праверком растлумачвае, што т. Гарнашэвіч з партыі ня выключаны, а толькі атрымаў вымову.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

Групком Працасьветы № 5 і Савецкая Працоўная Школа № 15 з вялікім жалем паведамляюць аб нечаканай сьмерці актыўнейшага працаўніка 5 групкому і былога загадчыка і настаўніка 15 сав. прац. школы

Т. КАЎПАКА Аляксандра Міхайлавіча

Пахаваньне адбудзецца 12 лістапада ў 3 1/2 гадз. дня.

Вынас цела з 1-ай сав. бальніцы (Ленінская вул.). Просьба да ўсіх сяброў саюзу працасьветы, настаўнікаў і вучняў 15 сав. школы прыняць удзел у пахаваньні.

Мясцком і супрацоўнікі Наркамасьветы з вялікім жалем паведамляюць, што ўночы з 9 на 10 лістапада г. г. памёр на адзінаццаты дзень пасьля апэрацыі Навуковы сакратар Навук. Мэтадалёгічнага Камітэту НКА

Т. КАЎПАК Аляксандр Міхайлавіч

Вынас цела з 1-ай сав. бальніцы будзе сёньня, 12 лістапада у 3 1/2 г. дня. Запрашаюцца ўсе асьветнікі гор. Менску, вучні, курсанты і ўсе знаёмыя прыняць удзел у пахаваньні.

ГЭАТР і КІНО

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

ЧАЦЬВЕР, 14-га лістапада адкрыты спэктакль. Білеты ў рабкасе і ў касе тэатру. А. Гальфорке. БОТВІН.

ПЯТНІЦА, 15-га лістапада для капэраван. арцелеў і самадзейн. тужн. адзінак. Білеты ў клюбе саматужнікаў. Ц. Дашэўскі. ПАЯДЫНАК МАШЫН.

СУБОТА, 16-га лістапада адкрыты спэктакль. Білеты ў рабкасе і ў касе тэатру

НЯДЗЕЛЯ, 17-га лістапада для саюзу мэталістых. Білеты ў саюзе.

Пачатак спэктакляў роўна а 8 з пал. гадз. увеч.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА — Буйны мастацкі фільм па славутым рамане Ф. ГЛЯДКОВА ЦЭМЭНТ. Звыш праграмы Першы год пяцігодкі. Пачатак роўна а 7 г. увеч. Каса—ад 5 г.

КІНО Інтэрнацыянал — Амэрыканскі фільм НЕБАСКРОБ. драма ў 6 частках. Звыш праграмы хроніка „Совкино" № 60

КІНО Пралетары — Новы фільм вытворч. „Совкино" з жыцьця вандроўных цыркачоў АПОШНІ АТРАКЦЫЁН. драма ў 6 частках. Звыш праграмы кіно-хроніка „Совкино" № 62. Пачатак—а 7 г. увеч. Каса—ад 5 з пал. г.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр" — Выдатны фільм ВАСЯ РЭФАРМАТАР у 6 частках. Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дня. Па нядзелях і серадах ад 12 гадз. дня. Цена білета 10 кап.

КІНО СпартаК — Сусьветны баявік ДРУГОЕ ЖЫЦЬЦЁ трагэдыя ў 8 частках. Пачатак 1 сэансу а 6 г. 30 м. Каса—ад 5 г.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты да 2 гадзіны дня

ІНСТЫТУТ АХОВЫ ПРАЦЫ ПРЫ НАРКАМПРАЦЫ БССР

АБВЯШЧАЕ

КОНКУРС

на заняцьце наступных пасад:

1. Заг. аддзелам прамысловай гігіены (інжынэр або доктар), аклад 200 руб.
2. Лябарант хэмічнай лябараторыі (хэмік), аклад 120 руб.
3. Асыстэнт па мясцовых дасьледваньнях (доктар), аклад 120 руб.
4. Тэхнік па аддзелу тэхнікі бясьпечнасьці і санітарнай тэхнікі, аклад 120 руб.
5. 2 навуковых супрацоўнікі лябараторыі фізіялёгіі працы (дактары), аклад 100 руб.
6. Навуковы супрацоўнік аддзелу арганізацыі працы, аклад 100 руб.
7. Навуковы супрацоўнік псыха-тэхнічнай лябараторыі (пажадана доктар), аклад 100 р.
8. Навукова-тэхнічны супрацоўнік па мясцовых дасьледваньнях, аклад 75 руб.
9. Навукова-тэхнічны супрацоўнік па аддзелу арганізацыі працы, аклад 75 руб.
10. Санітарны доктар, аклад 120 руб.

Заявы і дакуманты падаваць на імя дырэктара Інстытуту Аховы Працы **да 20 лістапада.**

Дырэктар Інстытуту Аховы Працы Дзіхцяр.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ЯЎРЭЙСКАГА — МЭДЫЧНА-САНІТАРНАГА Т-ВА

Ленінская, побач з 2-м Домам Саветаў, № 25, тэл. 12-6

АДКРЫТА ад 3 гадз. дня да 9 гадз. увеч

Прыём па ўсіх спэцыяльнасьцях: унутраных, хірургічныя, жаночыя, зубныя, вока нораў, вуха, горла, носа і скуры

ПРЫМАЮЦЬ ПА ПАПЯРЭДНІМ ЗАПІСЕ

Па хваробах вока—праф. Камінскі па пятніцах з 3 гадз. дня.
Па хваробах вуха, горла і носа—праф. Бурак—па пятніцах з 3 гадз. дня.
Па жаночых хваробах—праф. Выдрын—па чацьвяргох з 7 гадз. увеч.
Па хірург. хваробах—праф. Рубашоў—па пятніцах з 6 гадз. увеч.
Па страўн.-кішэчн.—дацэнт Манасзон па аўторках і чацьвяргох ад 8 гадз. увеч.
Па хваробах скуры—д-р Розэнталь па аўтораках і суботах ад 8 г. увеч.
Па ўнутр. хваробах—праф. Мелніх—па чацьвяргох ад 6 г. увеч.
Па ўнутр. хваробах—праф. Гаусман па серадах ад 6 г. увеч
Па хірург. хваробах—праф. Сакалоўскі—па чацьвяргох ад 6 г. увеч.
Па нэрвовых хваробах—праф. Кроль—па чацьвяргох ад 6 гадз. увеч.

Фізіятрычны габінэт: кварц, электра і сьвета-лячэньне.

Рэнтгенаўскі габінэт робіць здымкі, прасьвечваньні і лячэньне хворых. Прыём хіміка-бактэрыял. аналіза ў

Прыём хворых па лекавых кніжках таварыства.

— Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную плату —

Згублены рэдыкюль з грашыма, пэнсіяй і адбіткам дакум.: пасьведчаньне, выд. Менкамгасам на імя Яваводзкага, Ёлінскай і Бароўскай,—лічыць несапраўдным. Знайшоўшага просьба зьвярнуць па адрасе: Гарбарная вул. № 33 кв. 7 за ўзнагароду.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ даставкі газэты „ЗЬВЯЗДА" звяцеце па тэл. 2-49

Для здачы АБВЕСТКІ ў газэту „ЗЬВЯЗДА" звяцеце па тэл. 7-81

ТАБЛІЦА ВЫЙГРЫШАЎ

2-й рэчавай лётарэі Менскага т-ва „Прыхільнікі Дзяцей"

1 лістапада 1929 году.

Адрэсы паркалю: 03013, 04637, 05133, 05762, 08002, 08